ДУ «ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА»

Аддзел краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Інфармацыйнае паведамленне

III КВАРТАЛ

Віцебск 2019

ДУ "ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА"
Аддзел краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

III квартал

2019

Інфармацыйнае паведамленне

ВІЦЕБСК
2019

УДК 008

ББК 71.41(4Беи–4Вит)

К90

Складальнік *Т. В. Пацалуёнак*

Рэдактар *А. В. Ігнаценка*

Адказны за выпуск *Т. М. Адамян*

Культурнае жыццё Віцебскай вобласці : III квартал 2019 года : інфармацыйнае паведамленне / ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», Аддзел краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі ; [склад. Т. В. Пацалуёнак]. – Віцебск, 2019. – 55 с.

Штомесячнае інфармацыйнае паведамленне разлічана на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне.

Прызначана для спецыялістаў інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцаў, выкладчыкаў, студэнтаў і іншых катэгорыяў карыстальнікаў.

© ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», 2019

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

III квартал 2019

Інфармацыйнае паведамленне

Складальнік **Пацалуёнак** Таццяна Віктараўна

Адказны за выпуск Т. М. Адамян

Камп’ютарная вёрстка А. В. Юпатавай

Надрукавана на ксераксе ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна»

210601, г. Віцебск, вул. Леніна, д. 8а

E-mail: kray@vlib.by, vlib@vlib.by

Мерапрыемствы, якія не ўвайшлі ў папярэдні выпуск

Напрыканцы **чэрвеня** ў Матырынскім СДК Ушацкага раёна было праведзена «Свята ручніка», на якім прысутнічалі работнікі культустаноў раёна, кіраўніцтва гэтай сферы, матырынцы і ўсе жадаючыя. Задавалі тон удзельнікі народнага фальклорнага калектыву «Матырынская спадчына» і юныя танцоры з узорнага дзіцячага калектыву «Спадчына». Госці свята мелі магчымасць даведацца пра выкарыстанне саматканых ручнікоў, якія суправаджалі чалавека ад нараджэння да смерці. Ім былі прапанаваны гульнёвая праграма «Ад весялосці не бывае злосці», конкурс прыпевак, удзел у побытавых танцах «Скокі па-матырынску» і адметны мясцовы брэнд – клёцкі. (*Патрыёт. – 2019. – 13 ліп. – С. 1, 5.*)

ПРАДМОВА

«Культурнае жыццё Віцебскай вобласці» – штомесячнае інфармацыйнае паведамленне, разлічанае на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне. Выданне можа быць карысным спецыялістам інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцам, выкладчыкам, студэнтам і іншым катэгорыям карыстальнікаў.

Пастаянная рубрыка «Хроніка падзей» уключае аналітычна перапрацаваную інфармацыю, падрыхтаваную па матэрыялах абласной газеты «Витебские вести», гарадскіх і раённых газет Віцебскай вобласці за перыяд з 1 ліпеня па 30 верасня 2019 года, і ўтрымлівае звесткі, прадастаўленыя Віцебскім абласным метадычным цэнтрам народнай творчасці і цэнтральнымі бібліятэкамі вобласці.

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

КУЛЬТУРА

АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ КУЛЬТУРЫ

3 ліпеня Віцебшчына ўрачыста адзначыла Дзень Незалежнасці і 75-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Жыхары абласнога цэнтра сабраліся ля памятнага знака «Орден Победы». Туды даставілі факел Перамогі, полымя якога запалілі ў г. п. Лёзна – першым населеным пункце вобласці, які быў вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Прадстаўнікі працоўных калектываў і грамадскасці прайшлі па Маскоўскім праспекце да Вечнага агню на плошчы Перамогі. Адбылося ўскладанне вянкоў і кветак, прайшоў мітынг, затым – ваенны парад. Святочныя пляцоўкі былі арганізаваны ў розных кутках Віцебска. Выступілі аркестры і лепшыя артысты вобласці, рамеснікі наладзілі выставы сваіх вырабаў. Была ўрачыста адкрыта мемарыяльная дошка ўдзельніку Вялікай Айчыннай вайны, Ганароваму грамадзяніну Віцебска, Мікалаю Аляксандравічу Сакмаркіну. На плошчы Перамогі прайшоў канцэрт «За сильную и процветающую Беларусь». На Докшыччыне святкаванне пачалося напярэдадні, 2 ліпеня, у г. п. Бягомль. У праграме: тэатралізаванае прадстаўленне «Партызанскі аэрадром», патрыятычнае шэсце «Беларусь памятае», канцэртная праграма «Жыву і дыхаю, мой родны край, табой». 2 ліпеня ў аг. Ноўка адбылося маштабнае і відовішчнае мерапрыемства ў сувязі са святкаваннем 95-годдзя ўтварэння Віцебскага раёна і 75-годдзя вызвалення Беларусі. У праграме: урачысты мітынг, кірмаш «Край мой – гонар мой» з удзелам сельсаветаў раёна, шэсце працоўных калектываў, конкурс юных мастакоў, паказальныя выступленні ваеннаслужачых, спартыўныя спаборніцтвы. На ўрачыстасці ў г. Сянно прыехалі дэлегацыі з расійскіх рэгіёнаў-партнёраў – Пясчанакопскага

34-ы тэатральны сезон віцебскія лялечнікі адкрылі музычнай казкай-фантазіяй па матывах твора братоў Грым «Брэменскія музыкі» і дыскатэкай.

МУЗЫЧНАЕ ЖЫЦЦЁ

5 верасня на плошчы Перамогі ў Віцебску гучала музыка выдатнага беларускага кампазітара Яўгена Глебава ў выкананні студэнцкага духавога аркестра і салістаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі ў рамках гастрольна-канцэртнага тура «Музычная спадчына Беларусі».

6-8 верасня на тэрыторыі турыстычнага комплексу «Красный Бор» у Верхнядзвінскім раёне адбыўся фестываль бардаўскай песні «Охота петь» з удзелам выканаўцаў з Беларусі, Расіі, Польшчы, Латвіі, Украіны і Ізраіля.

ФОТАМАСТАЦТВА

«Асенні вернісаж» – фотавыстава пад такой назвай адкрылася **ў верасні** ў Шаркаўшчынскім раённым Цэнтры рамёстваў. Аўтар фатаграфій савецкага перыяду і сучаснасці – мясцовы фотамастак Валянцін Гарадзецкі.

У **верасні–кастрычніку** ў выставачнай зале музея гісторыі і культуры Наваполацка экспанавалася выстава «Настрой у аб’ектыве» юнага наваполацкага фатографа Анастасіі Мясніковай.

ТЭАТРАЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ

Народная артыстка Беларусі, актрыса тэатра імя Я. Коласа **Святлана Акружная** ўзнагароджана нагрудным знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «За ўклад у развіццё культуры Беларусі». У гэтым годзе Святлана Арцёмаўна адзначае 50-годдзе творчай работы на коласаўскай сцэне.

1 жніўня Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Я. Коласа завяршыў 93-ці сезон прэм'ерай спектакля «Яшчэ раз пра каханне» паводле апавяданняў Васіля Шукшына. Пастаноўшчык – заслужаны дзеяч мастацтваў Расіі Юрый Пахомаў. Ён жа з'яўляецца аўтарам інсцэніроўкі і музычнага афармлення спектакля. Мастак-пастаноўшчык – Андрэй Жыгур. Пераклад на беларускую мову зрабіў Алесь Замкоўскі. У спектаклі занятыя артысты Пётр Ламан, Георгій Лойка, Арцём Блахін, Святлана Сухадолава і інш.

8 верасня на вялікай сцэне Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы спектакль Коласаўскага тэатра «Сымон-музыка» адкрыў XXIV Міжнародны тэатральны фестываль «Белая вежа».

10 верасня тэатр імя Я. Коласа адкрыў свой 94-ы тэатральны сезон традыцыйна народнай камедыяй «Несцерка». Адначасова гэта быў і бенефіс вядучага майстра сцэны тэатра Пятра Ламана, які 11 ліпеня адзначыў сваё 70-годдзе і ў чарговы раз парадаваў гледача ў галоўнай ролі Несцеркі.

Беларускі тэатр «Лялька» са спектаклем «Жыў-быў Заяц» прымаў удзел у I Міжнародным фестывалі тэатраў лялек і кніг «Книжный шкап», які адбыўся **6–8 верасня** на сцэне Брэсцкага тэатра лялек.

Новы дзіцячы спектакль «Казкі пра казку» прадставіў тэатр «Лялька» на 6-м Міжнародным фестывалі тэатраў лялек «Чаепитие в Мытищах», які праходзіў **19–24 верасня** ў Падмаскоўі. Яго паставіў рэжысёр Міхась Клімчук сумесна з расійскай мастачкай Соф'яй Шахноўскай па творах беларускага аўтара Ганны Селівончык.

Растоўскай вобласці і Пачынка Смаленскай вобласці. Раздзялілі радасць свята вызвалення з расонцамі прадстаўнікі адміністрацый, дэпутаты з гарадоў суседняй Пскоўскай вобласці і Латвіі, з якімі наладжаны дзелавыя і культурныя сувязі. У райцэнтры былі арганізаваны мітынг-рэквіем «Нам жить и помнить», канцэрт дзіцячых калектываў «Віншуем Беларусь!», выступленні лепшых самадзейных артыстаў раёна і гасцей з Себежа і Апочкі Пскоўскай вобласці. У Верхнядзвінску 75-годдзе вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў адзначылі разам з Днём горада. На свяце прысутнічалі дэлегацыі з латвійскага горада Краславы, расійскіх Пскова, Себежа і Валакаламска, з якімі верхнядзвінцаў звязваюць даўнія сяброўскія адносіны. У Чашніцкім раёне да свята было прымеркавана адкрыццё новай стэлы на месцы дыслакацыі партызанскага атрада Уладзіміра Лабанка і конкурс патрыятычнай песні. У парку Воінскай славы г. Дуброўна былі ўрачыста адкрыты помнікі ўраджэнцам раёна М. І. Смарчкову і І. Д. Кандрацьеву. У Шаркаўшчыне прайшло раённае свята «Прыдзісненскія крыніцы». Жыхары Глыбокага адсвяткавалі 605-годдзе райцэнтра. На Полаччыне грамадзянска-патрыятычныя акцыі аб'ядналі тысячы людзей. 2 ліпеня на мемарыяльным комплексе «Урочышча Пяскі» была праведзена гарадская акцыя «Память вечна», на гісторыка-культурным комплексе «Поле ратнай славы» – мітынг «Великий подвиг ваш история хранит». Урачыстыя мерапрыемствы ў Гарадку былі прымеркаваны і да 95-годдзя з дня ўтварэння Гарадоцкага раёна ў тых межах, у якіх ён існуе сёння. У рамках свята музычныя падарункі рабілі ўдзельнікі творчых калектываў Гарадоцкага ГДК і ВІА «АртМастер» з Пскоўскай філармоніі. Неад'емнай часткай святкавання Дня Незалежнасці ў Шуміліне стаў раённы агляд-конкурс пляцовак сельсаветаў на тэму «Памяць вогненных гадоў», у рамках якога прайшоў цікавы конкурс «Луста хлеба». У выставачнай зале «Гісторыя воінскай славы Баравухі» адбылася прэзентацыя кнігі «Память войны стучит нам в сердца», падрыхтаванай супрацоўнікамі музея гісторыі і культуры Наваполацка. У Бешанковічах адбылася цырымонія адкрыцця капсулы, закладзенай на Кургане Славы ў

1994 годзе. Запавет сённяшняга пакалення быў змешчаны ў новую капсулу, якую адкрыюць на 100-гадовую гадавіну вызвалення – 26 чэрвеня 2044 года.

Шматлюднай, яркай і ўрачыстай была сёлетняя сустрэча на Кургане Дружбы. **7 ліпеня** тут у 60-ы раз сабраліся ветэраны партызанскага руху, былыя франтавікі, прадстаўнікі ўлады, грамадскіх арганізацый, грамадзяне Беларусі, Расіі, Латвіі і іншых краін, каб пацвердзіць сваю прыхільнасць ідэалам міру, добрасуседства і справядлівасці, за якія ваеннае пакаленне самааддана змагалася ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Адкрыты 3 ліпеня 1959 года на стыку трох рэспублік, Курган Дружбы стаў месцам сяброўства і яднання народаў. Гаспадаром свята сёлета быў расійскі бок, таму сустрэча пачалася на тэрыторыі Расіі з ускладання кветак да помніка разведчыцы Марыі Пынто. Пасля мітынгу адбыліся выступленні воінаў-пагранічнікаў і кінолагаў з сабакамі, дэсантнікаў 76-й гвардзейскай дэсантна-штурмавой Чарнігаўскай Чырванасцяжнай дывізіі. Канцэртную праграму склалі выступленні ансамбля песні і танца Заходняй ваеннай акругі і ўзорна-паказальнага аркестра Акадэмічнага ансамбля песні і танца войск нацыянальнай гвардыі, а таксама група «Партызан FM». На жаль, ветэранаў засталося мала, таму на Кургане больш іх дзяцей, унукаў і праўнукаў.

13 ліпеня Лёзненскі раён наведалі міністр культуры Рэспублікі Беларусь Ю. П. Бондар і начальнік упраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама П. М. Падгурскі. Яны наведалі мемарыяльны комплекс «Адаменская горка» і ўсклалі кветкі. У ходзе візіту пазнаёміліся з дзейнасцю Лёзненскага ваенна-гістарычнага музея, раённага Цэнтра культуры, культурна-аздараўленчага цэнтра, Дома культуры аграгарадка Новае Сяло.

Ганаровае званне «Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь» прысвоена **Наталлі Аляксандраўне Чарнюк** – кіраўніку заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь харэаграфічнага ансамбля «Зорька».

якую прадставілі ўмеліцы народнага клуба лапікавага шыцця «Рошва» з г. Полацка.

Дырэктар Бешанковіцкага раённага Дома рамёстваў Алеся Аўчыннікава прадстаўляла свой роспіс па шкле на традыцыйным «Ягелонскім кірмашы» ў польскім Любліне, які праходзіў **16–18 жніўня**. (*Зара. – 2019. – 27 жн. – С. 3.)*

22 жніўня ў выставачнай зале Музея гісторыі і культуры г. Наваполацка распачалася аўтарская выстава выцінанак «Папяровы бум». Аўтар – член Саюза майстроў народнай творчасці Рэспублікі Беларусь, адзін з вядучых майстроў гэтага віду дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Полаччыны Алена Ходзікава.

У **верасні** ў Аршанскай гарадской мастацкай галерэі В. А. Грамыкі адкрылася выстава «25 лет в ремесле», прысвечаная 25-гадоваму юбілею Аршанскага Дома рамёстваў. У экспазіцыі прадстаўлена каля 400 работ майстроў народнай творчасці Аршаншчыны, выкананых у розных тэхніках: бісерапляценне, лозапляценне, саломапляценне, разьба па дрэве, вышыўка, ткацтва, кераміка, жывапіс на скуры і інш.

Выстава «Восеньскія матывы» адкрылася **ў верасні** ў выставачнай зале Глыбоцкага Дома рамёстваў. Аўтары экспазіцыі – творчая сям'я Ганны і Сяргея Рымдзёнкаў з Шаркаўшчыны. Яны прадставілі ўвазе наведвальнікаў тканыя і керамічныя вырабы.

У **верасні** справіў наваселле Верхнядзвінскі Дом рамёстваў. Народны фальклорны калектыў «Сенькавіца» правёў абрад «Уваходзіны». Майстры разгарнулі выставы сваіх вырабаў, правялі майстар-класы па спіральным пляценні і саломапляценні, ткацтве, бісерапляценні. Для дзяцей быў арганізаваны квэст «Скрыня скарбаў».

9 верасня ў выставачнай зале Віцебскага АМЦНТ адкрылася выстава эксклюзіўных упрыгажэнняў з натуральных камянёў пад назвай «Мир самоцветов».

НПГКМЗ. На ёй прадстаўлена творчасць Лазара Рана, Арлена Кашкурэвіча і Анатоля Зайцава.

12 мастакоў з Беларусі, Расіі і Украіны прымалі ўдзел у пленэры партрэтнага жывапісу, які праходзіў напрыканцы **жніўня** ў музеі-сядзібе І. Я. Рэпіна «Здраўнёва» і быў прымеркаваны да 175-годдзя з дня нараджэння знакамітага мастака. Героямі карцін сталі 24 мясцовыя жыхары, вобразы якіх увойдуць у партрэтную галерэю сучаснага здраўнёўскага сезона.

У жніўні ў Лепельскім раённым краязнаўчым музеі пачала экспанавацца выстава жывапісных работ мастака Сяргея Прывады, ураджэнца Лепельшчыны, які жыве і працуе ў Наваполацку.

На працягу **жніўня** ў Мастацкай галерэі Полацка экспанавалася выстава «Імгненні» вядомага віцебскага акварэліста Аляксандра Карпана. У **верасні** каля 50 акварэльных работ мастака былі прадстаўлены ў выставачнай зале музея гісторыі і культуры Наваполацка.

20 верасня ў Аршанскай гарадской мастацкай галерэі В. А. Грамыкі адбылося адкрыццё выставы «Дорогами художника-земляка», прысвечанай 100-годдзю з дня нараджэння Пятра Міхайлавіча Раманоўскага. У экспазіцыі змешчаны больш 30 жывапісных палотнаў, а таксама фотадакументы і асабістыя рэчы вядомага ўраджэнца Оршы.

Выстава «На жыццёвым шляху: спатканні і ўражанні», прымеркаваная да 70-гадовага юбілею шаркаўшчынскага мастака Віктара Крука, экспанавалася **ў верасні** ў Мастацкім музеі Віцебска.

У **верасні** пачала экспанавацца выстава «Мастак – гэта загадка» ў выставачнай зале Лепельскага Цэнтра рамёстваў. Аўтар – мясцовы мастак Леанід Масцінскі.

ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА

У выставачнай зале Глыбоцкага Цэнтра традыцыйнай культуры і народнай творчасці ў **ліпені** экспанавалася выстава «Кветкі райскага сада»,

Салістка канцэртнай залы Полацкага Сафійскага сабора **Ксенія Максімаўна Пагарэлая** ўдастоена ганаровага звання «Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь» за значны асабісты ўклад ў развіццё нацыянальнай культуры, зберажэнне і прапаганду лепшых музычных традыцый.

«Знай героев в лицо» – так называлася праграма ўрачыстага адкрыцця пасля рэстаўрацыі сквера імя М. П. Шмырова ў абласным цэнтры. Былі арганізаваны выставы-прэзентацыі пад адкрытым небам, працавала інтэрактыўная пляцоўка «Беларусь помнит» ГА «БРСМ». Асаблівую ўрачыстасць мерапрыемству надавалі выступленні ўзорнага аркестра духавых інструментаў СШ № 33, вакальнай групы гімназіі № 8.

На разгляд 12-й сесіі Расонскага раённага Савета дэпутатаў, якая адбылася **12 верасня**, было вынесена пытанне: «Аб рабоце аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Расонскага райвыканкама па рэалізацыі прыярытэтных накірункаў дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры».

13–14 верасня жыхары Ушаччыны адсвяткавалі 95-годдзе ўтварэння раёна. У рамках святкавання юбілею ў райцэнтры адкрылася этнаграфічная выстава «Жыццё і быт ушачан 19–20 стагоддзя», якая будзе дзейнічаць на пастаяннай аснове. Прайшла сустрэча з вядомымі землякамі – дзеячамі навукі і культуры. На будынку Ушацкай школы ўрачыста адкрылі памятную дошку ў гонар праслаўленых выпускнікоў – Рыгора Барадуліна, Еўдакіі Лось, Генадзя Гарбука. Працавалі падворкі нацыянальнай культуры і быту ўшачан, конкурсна-інфармацыйная пляцоўка Музея народнай славы, праходзілі шматлікія конкурсы і выставы, канцэртныя праграмы і майстар-класы.

19–20 верасня на базе ўстаноў культуры Аршанскага і Лёзненскага раёнаў Дзяржаўнай установай культуры змешанага тыпу «Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур» сумесна з Віцебскім абласным метадычным цэнтрам народнай творчасці быў праведзены рэспубліканскі семінар-практыкум «Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці дзяцей і моладзі сродкамі традыцыйнай культуры. З вопыту работы ўстаноў культуры па

развіцці фальклору і народных мастацкіх рамёстваў у рэгіёнах Віцебскай вобласці». У ім прынялі ўдзел больш за 40 спецыялістаў з усіх рэгіёнаў рэспублікі – метадысты абласных цэнтраў народнай творчасці, дырэктары Дамоў (Цэнтраў) рамёстваў, кіраўнікі дзіцячых калектываў па фальклоры і дэкаратыўна-прыкладной творчасці. У першы дзень удзельнікі семінара здзейснілі экскурсіі ў Комплекс былога езуіцкага калегіума і этнаграфічны музей «Млын» у Оршы, пазнаёміліся з дзейнасцю Аршанскага Дома рамёстваў, Лёзненскага раённага Цэнтра культуры і Лёзненскага раённага Дома рамёстваў. Мерапрыемствы другога дня семінара праходзілі ў Цэнтры народнай творчасці і рамёстваў г. п. Копысь Аршанскага раёна. Тут адбыліся выставы работ дэкаратыўна-прыкладной творчасці, майстар-класы, прэзентацыя дзейнасці клуба этнаграфіі і фальклору «Капышане», спектакль лялечнага тэатра «Батлейка» Аршанскага раённага Дома культуры і выступленне ўдзельнікаў узорнага фальклорнага калектыву «Шчодрыкі» Палаца культуры г. Барань.

28–29 верасня Браслаў стаў сталіцай абласнога фестывалю-кірмашу працаўнікоў сяла «Дажынкі-2019». Работнікі культуры стварылі ўдзельнікам і гасцям атмасферу незабыўнага свята. Культурна-забаўляльная праграма здзіўляла сваёй маштабнасцю і разнастайнасцю. Працавалі тэматычныя пляцоўкі, выставы, праходзілі майстар-класы па вырабе сувеніраў, паказальныя выступленні. Нямала жадаючых сабрала сельскагаспадарчая фотазона «Лэнд-арт» з саламянымі міні-скульптурамі. Добры настрой дарылі самадзейныя артысты на канцэртнай пляцоўцы «Дажыначны карагод» на «Брукоўцы». У рамках акцыі «75 мірных гадоў» нават самыя маленькія ўдзельнікі майстар-класа па арыгамі змаглі вырабіць папяровых галубоў і жураўлёў. У Леснічоўцы, на галоўнай сцэне фестывалю-кірмашу, падчас цырымоніі ўручэння прэмій пераможцам працоўнага спаборніцтва гучалі канцэртныя віншаванні ў выкананні прафесійных і самадзейных артыстаў. Своеасаблівым падарункам-сюрпрызам стала выступленне заслужанай артысткі Расіі Варвары, якое гарманічна ўпісалася ў стылістыку фестывалю.

свята харавой музыкі «Славянский благовест». Упершыню на «Славянскім базары» прайшло выступленне Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага балета на лёдзе. У рамках фестывалю ў чацвёрты раз праведзена свята-конкурс майстроў саломапляцення «Папараць-кветка». Умельцы з розных рэгіёнаў Беларусі, а таксама Расіі і Украіны сталі ўдзельнікамі Міжнароднага конкурсу майстроў мастацкіх рамёстваў па традыцыйнай свістульцы «Салавейка». 16 выканаўцаў з розных краін змагаліся за перамогу ў XXVIII Міжнародным конкурсе маладых выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2019». Міжнароднае журы на чале з народнай артысткай Расіі і Грузіі Тамарай Гвердцытэлі прысудзіла Гран-пры Адзільхану Макіну з Казахстана. Заветная «Ліра» была ўручана спеваку на канцэрце ўрачыстага закрыцця фестывалю. Малады выканаўца атрымаў таксама спецыяльны прыз Прэзідэнта Беларусі «Славянская надежда». Усяго на «Славянскім базары-2019» было праведзена больш за 160 мерапрыемстваў.

Мастацка-графічны факультэт ВДУ імя П. М. Машэрава, створаны **1 верасня** 1959 года, адзначыў 60-годдзе. За гады свайго існавання факультэт выпусціў звыш 5,6 тыс. спецыялістаў. На ўрачыстасці ў Віцебск прыехалі былыя выпускнікі з розных гарадоў Беларусі, Расіі, Латвіі, Малдовы, Украіны, Арменіі, іншых краін. У юбілейнай праграме: навуковая канферэнцыя, лекцыі па творчасці вядомых выпускнікоў, выставы, канцэрт-прэзентацыя факультэта.

ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА

Віцебскі мастак, ураджэнец Лепельшчыны, Алег Скавародка **ў ліпені** адкрыў персанальную выставу «Святло Радзімы» ў Лепельскім раённым краязнаўчым музеі. У экспазіцыі прадстаўлены творы 1970–2018 гадоў. У жніўні Алег Аляксандравіч быў узнагароджаны медалём Францыска Скарыны за значны ўклад у развіццё і прымнажэнне культурнай спадчыны беларускага народа.

У Мастацкім музеі Полацка **ў ліпені** экспанавалася выстава «Вялікія графікі Беларусі», створаная на аснове фондавых калекцый

МАСТАЦТВА

7 ліпеня Віцебск адсвяткаваў 132-годдзе з дня нараджэння сусветна вядомага мастака Марка Шагала. Па традыцыі ў двары Дома-музея Марка Шагала на вуліцы Пакроўскай было праведзена свята «У гасцях у Марка і Бэлы», на якім выступіў народны яўрэйскі вакальна-харэаграфічны ансамбль «Витебские девчата».

9–17 ліпеня адбыўся XXVIII Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Па традыцыі адкрыў яго Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка. На ўрачыстай цырымоніі глава дзяржавы ўручыў спецыяльную ўзнагароду «Через искусство – к миру и взаимопониманию» народнай артыстцы Украіны Таісіі Павалій. Спецыяльны прыз «Залатая ліра» з рук Прэзідэнта атрымала прадстаўніца Беларусі Ксенія Галецкая, якая заваявала Гран-пры Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу «Віцебск-2019». У рамках фестывалю адбылося святкаванне 20-годдзя ўтварэння Саюзнай дзяржавы. У Мастацкім музеі адкрылася выстава «Растоўская фініфць». Ювеліры групы «Смоленские бриллианты» прадставілі рэпліку Вялікай Імператарскай кароны. Галоўнай тэмай канцэрта «Союзное государство приглашает…» стала святкаванне 50-годдзя творчай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ансамбля «Песняры». У кінатэатры «Мір» прайшлі Дні карэйскага кіно. Міжнародны фестываль-конкурс барабаншчыц і мажарэтак сабраў у фестывальным Віцебску 28 калектываў з рэгіёнаў Віцебскай вобласці і расійскіх гарадоў Вялікія Лукі, Бранск і Кімры. Лялечнікі і перформеры, музыканты і паэты, танцоры і тэатральныя артысты з Беларусі і бліжняга замежжа прынялі ўдзел у фэсце вулічнага мастацтва «На сямі вятрах». Традыцыйна ажыўлена было ў фестывальныя дні ў «Лялечным квартале». Цырк з кітайскай правінцыі Шэньсі прывёз праграму «Радуга на шелковом пути». «Тэатральныя сустрэчы» былі прадстаўлены спектаклямі маскоўскіх тэатраў «Эрмитаж», «Театр на Юго-Западе» і тэатра «Санкт-Петербургский драматический театр на Васильевском». У рамках фестывалю адбылося

КУЛЬТУРНЫЯ СУВЯЗІ

5–6 ліпеня дэлегацыі Міёрскага і Расонскага раёнаў прадстаўлялі Беларусь на V Міжнародным фестывалі «Река Великая» ў г. Апочка Пскоўскай вобласці. Фестываль накіраваны на адраджэнне і далейшае развіццё культурных і гістарычных традыцый паўночна-заходняга краю Расіі, захаванне і развіццё добрасуседскіх адносінаў з жыхарамі прыгранічных тэрыторый. У канцэртна-конкурснай праграме «Музыкальный Вал-2019» прыняла ўдзел выхаванка ўзорнай эстраднай студыі «Надежда» (г. п. Расоны) Юля Іванова, якая адзначана дыпломам за II месца ў намінацыі «вакал».

12–13 ліпеня ў расійскім горадзе Уварава Тамбоўскай вобласці прайшоў IV фестываль «Вішневарава» (ранейшая назва «Вішнёвы сад»). Адзінай замежнай дэлегацыяй былі глыбачане, якія прадстаўлялі «вішнёвую» сталіцу Беларусі. Глыбокае сябруе з Уваравым не першы год, культурны абмен мацуецца. Сёлета на ўвараўскай зямлі пабывалі Анастасія Развадоўская ў ролі Вішнёвай каралевы і ўдзельнікі вакальнай групы «Глыбоцкія дзяўчаты».

19–21 ліпеня дэлегацыя Пастаўскага раёна пабывала ў Латвіі на свяце «Дні Рэзэкненскага краю». Народная эстрадная група «25 плюс-мінус» пад кіраўніцтвам Аляксея Конанава выконвала беларускія песні на канцэрце ў пасёлку Кауната, маладая сям’я Ладукас з Гуты была прызнана самай творчай па выніках міжнароднага конкурсу маладых сем’яў «Быць разам!».

20 ліпеня адбылося святкаванне 483-й гадавіны заснавання г. Веліжа і 92-годдзя ўтварэння Веліжскага раёна (Смаленская вобласць). У рамках добрасуседскага супрацоўніцтва на свята была запрошана дэлегацыя Віцебскага раёна. Знакавай падзеяй стаў VIII міжрэгіянальны фестываль творчых калектываў і выканаўцаў «Велижская волна», у якім прынялі ўдзел творчыя калектывы і выканаўцы Віцебскага раённага Цэнтра культуры і ансамбль барабаншчыц «Сунічкі» Лёзненскага РЦК.

21 ліпеня ў браслаўскім лесапарку «Леснічоўка» адбыўся канцэрт народнага танцавальнага калектыву «Каарэкі» з эстонскага горада Мяр'ямаа. У наступныя два дні аматарскі калектыў выступіў перад жыхарамі аграгарадкоў Браслаўшчыны.

22–24 ліпеня Гарадоцкі раён наведала дэлегацыя Бабаеўскага муніцыпальнага раёна Валагодскай вобласці Расійскай Федэрацыі, з якім Гарадоччына з 2012 года падтрымлівае сяброўскія адносіны ў розных галінах, у тым ліку ў сферы культуры. Адбыўся «круглы стол» з удзелам старшыні райвыканкама Пятра Карабача, госці пазнаёміліся з дзейнасцю Гарадоцкага Дома рамёстваў і фальклору і іншых устаноў культуры.

У **ліпені** народны ансамбль народнай песні «Крынічанька» Глыбоцкага ГДК прымаў удзел у VIII фальклорных спатканнях у польскім Вольштыне.

Узорны ансамбль танца і песні «Прыдзвінскія россыпы» Цэнтра культуры г. Наваполацка прадстаўляў Беларусь на Міжнародным фальклорным фестывалі «Белая лілея», які праходзіў **у ліпені** ў г. Кагул (Малдова).

Майстар-кераміст, член клуба «Майстар» Чашніцкага раённага Дома рамёстваў Святлана Арэхава прадстаўляла свае вырабы на XX Міжнародным фестывалі культуры і мастацтва «Бююкчэкменджэ», які праходзіў у **ліпені-жніўні** ў г. Стамбуле (Турцыя).

3 жніўня ў п. Радзіца-Крылоўка Бранскай вобласці адбыўся IV Міжнародны фестываль традыцыйнай казацкай культуры «Станица Брянская». На этнафестываль быў запрошаны народны ансамбль народнай песні «Весялуха» Бешанковіцкага РЦК. Артысты вярнуліся лаўрэатамі I ступені ў намінацыі «Вакальная творчасць».

Студыя эстраднага танца «Шеп» гарадскога Палаца культуры «Орша» заваявала Гран-пры на фестывалі дзіцячай і юнацкай творчасці «Я магу» ў абхазскім горадзе Піцунда. (*Аршанская газета. – 2019. – 10 жн. – С. 5.*)

Рашэннем Віцебскага аблвыканкама воданапорнай вежы сістэмы Шухава ля чыгуначнай станцыі Коханава Талачынскага раёна нададзены статус нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці рэгіянальнага значэння.

30 жніўня – 1 верасня Наўгародскі музей-запаведнік правёў V Усерасійскі фестываль дзіцячых музейных праграм «Онфим собирает друзей». Беларусь прадставіла загадчык Полацкага краязнаўчага музея Ірына Воднева, якая выступіла з дакладам «Выкарыстанне прыёмаў тэатралізацыі ў культурна-адукацыйнай дзейнасці стацыянарнай выставы «Прагулка па Ніжне-Пакроўскай».

1 верасня, у 80-ю гадавіну пачатку Другой сусветнай вайны, у Міёрах ушанавалі памяць воінаў-землякоў. На сцяне касцёла Узнясення Найсвяцейшай Дзевы Марыі ўрачыста адкрылі мемарыяльную дошку ў гонар выхадцаў з Беларусі, якія здабывалі мір у складзе польскай арміі пад камандаваннем генерала Уладзіслава Андэрса і ў іншых баявых злучэннях на Заходнім фронце ў 1939–1945 гг. У цырымоніі прыняў удзел намеснік пасла Рэспублікі Польшча ў Беларусі Марцін Вайцяхоўскі.

12 верасня на будынку СШ № 23 г. Віцебска была ўрачыста адкрыта мемарыяльная дошка, прысвечаная воіну-інтэрнацыяналісту Алегу Тувальскаму, і прайшоў мітынг памяці.

У **верасні** ў Віцебску прайшла Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Спадчына былых сінагог: у пошуках новых функцый і значэнняў», прысвечаная праблемам захавання, аднаўлення і эксплуатацыі старых рэлігійных будынкаў. Арганізатары – Беларускі камітэт ICOMOS і музей Марка Шагала. У рамках канферэнцыі адбылося пасяджэнне «круглага стала» на тэму «Вялікая Любавіцкая сінагога ў Віцебску. Зваротны рух ківача».

У Браслаўскім музеі традыцыйнай культуры **ў верасні** адкрылася выстава «Зямлі спрадвечнай рамяство». Усе выстаўленыя экспанаты былі ўзяты з фондаў музея і знаёмілі наведвальнікаў з тым, як зараджалася і развівалася земляробства на Браслаўшчыне.

захоўваецца ў Дзяржархіве Расійскай Федэрацыі, і здымкі пасляваеннага Полацка, якія зрабіў былы галоўны архітэктар горада Мікалай Глазуноў.

У **ліпені-верасні** ў Віцебскім музеі гісторыі прыватнага калекцыяніравання быў прадстаўлены праект «Свободное прочтение. Книга художника», арганізаваны Саюзам творчых дзеячаў «Международная гильдия мастеров» і Віцебскім абласным краязнаўчым музеем. Удзельнікі праекта – прафесійныя мастакі і дызайнеры Масквы і Санкт-Пецярбурга.

18 жніўня ў абласным цэнтры адбылося ўрачыстае адкрыццё мемарыяльнай дошкі Герою Савецкага Саюза, Ганароваму грамадзяніну горада Віцебска, праслаўленаму лётчыку Рыгору Іванавічу Багамазаву. На цырымоніі прысутнічаў вядомы скульптар Азат Тарасян – аўтар памятнага знака.

Стан аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны ў раёне і работа па іх зберажэнні былі разгледжаны на пасяджэнні Верхнядзвінскага райвыканкама. (*Дзвінская праўда. – 2019. – 27 жн. – С. 1–2.*)

30 жніўня адбылося адкрыццё выставы ўнікальных фатаграфій, кніг, гравюр, малюнкаў і акварэляў з прыватнай калекцыі былога міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь Пятра Краўчанкі. Экспазіцыя пад назвай «З Беларуссю ў сэрцы» прадстаўлена ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі.

У **жніўні** ў зале Шаркаўшчынскага райвыканкама прайшоў семінар пад назвай «Зберажэнне гісторыка-культурнай спадчыны малых рэгіёнаў Беларусі і замежжа». Арганізатар – дырэктар сацыяльна-інфармацыйнай установы «Традыцыі і інавацыі Паазер'я» Надзея Дударонак з Браслава. Удзельнічалі навукоўцы з Беларусі, Расіі, Нідэрландаў, якія на прафесійнай аснове займаюцца пытаннямі зберажэння, утрымання і рацыянальнага выкарыстання культурнай спадчыны. (*Кліч Радзімы. – 2019. – 31 жн. – С. 6.*)

У **жніўні-верасні** ў Чашніцкім гістарычным музеі была прадстаўлена экспазіцыя, якая падрабязна знаёміла наведвальнікаў з гісторыяй і сённяшнім днём Красналуцкага краю, вядомымі ўраджэнцамі і жыхарамі сельсавета, творамі народных умельцаў.

75-годдзе вызвалення Пскоўскага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў разам з расійскімі сябрамі святкавалі браслаўчане. Раён дэлегіраваў на ўрачыстасць народны ансамбль песні «На панадворку», які стаў удзельнікам вялікай канцэртнай праграмы. (*Витебские вести. – 2019. – 13 авг. – С. 7.*)

17 жніўня ў латвійскім горадзе Даўгаўпілсе адбыўся I Міжнародны фестываль вулічнага тэатра і клаўнады. Беларусь на ім прадстаўлялі маладзёжны тэатр «Колесо» (г. Віцебск) і народны тэатр мініяцюр «Покер» (г. Браслаў).

Сумесны праект «Вывучэнне і захаванне традыцыйных рамесніцкіх навыкаў жыхароў даліны Дзвіны/Даўгавы» пачалі рэалізоўваць упраўленне культуры Даўгаўпілскага краю, Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік і Браслаўскае раённае аб'яднанне музеяў. Фінансуе ініцыятыву Еўрапейскі Саюз.

У **жніўні** прадстаўнікі Расоншчыны наведалі Латвію ў рамках падпісанага ў 2010 годзе дагавора аб супрацоўніцтве паміж Расонскім раёнам і Карсаўскім краем. Латгальскія гарады Карсава і Віляка прымалі дэлегацыі, у склад якіх уваходзілі работнікі райвыканкама, творчыя калектывы, самадзейныя артысты і народныя майстры раённага Дома рамёстваў. Расонцы прынялі ўдзел у святкаванні 10-годдзя ўтварэння Карсаўскага краю і фальклорным фестывалі «Яблыневы сад».

Цыркавая студыя «Фантазёры» ДУК «Аршанскі гарадскі Цэнтр культуры «Победа» стала пераможцай XIII Міжнароднага цыркавога фестывалю «Мир полон чудес», які праходзіў у Латвіі. (*Витебские вести. – 2019. – 10 сент. – С. 6.*)

У рамках Тыдня беларускага пісьменства **3 верасня** ў Браслаўскай ЦРБ адбылася літаратурная сустрэча з паэтам, членам Саюза пісьменнікаў Беларусі, грамадскім дзеячам Станіславам Валодзькам з латвійскага горада Даўгаўпілса. Творца падтрымлівае сяброўскія стасункі з работнікамі ўстаноў культуры, мясцовы кампазітар Альберт Бялусь піша музыку да яго вершаў. Разам з паэтам прыехалі выканаўца песень Яўген Пашкевіч і

старшыня славянскага таварыства «Узоры» г. Ліванэ Лідзія Знатыня. На сустрэчу былі запрошаны работнікі культуры і школьнікі.

Дагдскі край Латвіі, які сябруе з беларусамі памежжа, прыслаў на рэгіянальнае свята «Збіраем зорны карагод» у аграгарадок Валынцы Верхнядзвінскага раёна не толькі афіцыйную дэлегацыю, але і самадзейных артыстаў для выступлення ў сумесным канцэрце.

«Спасаўкі» – пад такой назвай прайшло свята ў канцы **жніўня** ў Смаленску. Віцебскую вобласць прадстаўлялі народны фальклорны гурт «Гульбічы» Шумілінскага РЦК і майстры Шумілінскага Дома рамёстваў.

Па запрашэнні Цэнтра беларускай культуры і культурна-асветніцкага таварыства «Уздым» (г. Даўгаўпілс) браслаўскія культработнікі прынялі ўдзел у традыцыйных Днях беларускай культуры ў Латвіі, якія праходзілі **7 верасня**. Сумесна з гэтымі ўрачыстасцямі быў адкрыты і новы творчы сезон Беларускага дома ў Даўгаўпілсе. Сваёй творчасцю парадавалі ўдзельнікаў свята майстры Браслаўскага музея традыцыйнай культуры і народны ансамбль беларускай песні «На панадворку» Браслаўскага РЦК.

Міжнародны фестываль фальклору і рамёстваў «Смоленский рожок-2019», які адбыўся **8 верасня**, прынёс шэраг узнагарод творчым калектывам устаноў культуры г. Наваполацка. Першае месца прысуджана народнаму тэатру лялек «КапялюШ» Цэнтра рамёстваў і традыцыйнай культуры (намінацыя «Народнае тэатральнае мастацтва»). Удзельнікі народнага клуба майстроў і самадзейных мастакоў «Прамень» ЦРіТК Юлія Ярахновіч і Галіна Акуцёнак атрымалі перамогу ў намінацыях «Ганчарнае мастацтва і кераміка» і «Лепшая праца па матэрыяле». Тэатр народнай песні «Субацея» Цэнтра культуры стаў лепшым у намінацыі «Ансамблі народнай песні». Віцебскі раён прадстаўлялі майстры раённага Цэнтра народных мастацкіх рамёстваў «Адраджэнне». Надзея Гутнікава адзначана дыпломам I ступені ў намінацыі «Лепшая работа па тканіне».

Аўтар – фотамастак, член Рускага Геаграфічнага Таварыства, ураджэнец Шуміліншчыны Васіль Мясаедаў. Ва ўрачыстай абстаноўцы старшыня райвыканкама Алег Быкаў уручыў музею бюст Леніна, які перадаў Мікалай Панкрат, вядомы полацкі калекцыянер і заснавальнік прыватнага музейнага комплексу «Сэнс жыцця».

Работнікі Шумілінскага гісторыка-краязнаўчага музея ажыццявілі выязныя мерапрыемствы ва ўсе дзіцячыя аздараўленчыя лагеры на тэрыторыі раёна і прысвяцілі іх 75-й гадавіне вызвалення Беларусі і Шуміліншчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Выстава музейных экспанатаў дапамагала адчуць дух ваеннага часу. Праводзіліся конкурсна-забаўляльная праграма «З Цёркіным на прывале», патрыятычныя віктарыны, конкурсы «Моцная рука», «Музейны экспанат».

У **ліпені** ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі адкрылася выстава «Белое, красное, черное: символика цвета в народной культуре», якая пазнаёміла наведвальнікаў з фондавай калекцыяй музея Гомельскага палаца-паркавага ансамбля.

У ліпені ў г. п. Балбасава Аршанскага раёна была ўрачыста адкрыта мемарыяльная дошка двойчы Герою Савецкага Саюза Сяргею Іванавічу Грыцаўцу ў рамках святкавання 110-й гадавіны з дня нараджэння праслаўленага савецкага лётчыка.

Мемарыяльную дошку ў гонар Героя Сацыялістычнай Працы, Ганаровага грамадзяніна горада Віцебска, Мікалая Акімавіча Макарава ўсталявалі на будынку Віцебскага аддзялення Беларускай чыгункі з мэтай увекавечання памяці першага кіраўніка прадпрыемства.

На працягу **ліпеня–верасня** ў Полацкім музеі беларускага кнігадрукавання экспанавалася выстава «Полацкі фотаальбом. 1941–1947 гг.», прымеркаваная да 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На выставе прадстаўлены шэраг арыгінальных фатаграфій Полацка, выкананых нямецкімі салдатамі і афіцэрамі ў перыяд_акупацыі 1941–1944 гг., а таксама копіі фотаздымкаў з «Альбома разбурэння», які

2 верасня ў чытальнай зале ЦРБ адбылася тэматычная сустрэча «Крочым родным краем, старонкі гісторыі збіраем» для вучняў 8-х і 9-х класаў СШ № 1.

15 верасня работнікі ЦРБ запрасілі вучняў 4-х класаў СШ № 1 на тэатралізаваную экскурсію «Бібліятэка – тэрыторыя без межаў».

20 верасня народная літаратурна-музычная гасцёўня «Крыніца» правяла прэзентацыю новай кнігі пісьменніка і краязнаўцы Антона Параскевіна (У. В. Улюценкі) «Месяцаслоў Блаславёны». На сустрэчу прыйшлі чытачы раённай бібліятэкі, землякі пісьменніка, старшакласнікі СШ № 1. З любоўю да гісторыі сваёй роднай зямлі напісана гэтая кніга, якая, бясспрэчна, унясе значны ўклад у краязнаўства раёна.

МУЗЕЙНАЯ СПРАВА І АХОВА ПОМНІКАЎ

5 ліпеня ў Бешанковіцкім раённым гісторыка-краязнаўчым музеі адкрылася выстава пад назвай «Бешанковіцкі раён: гісторыя і сучаснасць», прымеркаваная да 95-годдзя ўтварэння раёна.

10 ліпеня ў г. Сянно адбылася ўрачыстая цырымонія адкрыцця памятнага знака «Боль» ахвярам гета, якое існавала ў райцэнтры ў верасні–снежні 1941 года. Аўтар памятнага знака – віцебскі скульптар Іван Казак.

Дырэктар Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка Тамара Джумантаева прыняла ўдзел у рабоце секцыі «Культурна-гуманітарныя праекты як сувязное звяно духоўнага жыцця народаў Расіі і Беларусі» ў рамках VI Форуму рэгіёнаў Расіі і Беларусі, які праходзіў **16–18 ліпеня** ў Санкт-Пецярбургу. Адбылося падпісанне пагадненняў аб супрацоўніцтве паміж НПГКМЗ і Наўгародскім дзяржаўным аб'яднаным музеем-запаведнікам, а таксама ўстановай культуры «Дзяржаўны мемарыяльны гісторыка-літаратурны і прыродна-ландшафтны музей-запаведнік А. С. Пушкіна «Міхайлаўскае».

23 ліпеня ў выставачнай зале Шумілінскага гісторыка-краязнаўчага музея адкрылася выстава «Фарбы жыцця: 75 імгненняў!».

15 верасня ў Глыбокім прайшоў канцэрт Ніжагародскага губернскага аркестра. Значная музычная падзея адбылася ў рамках умацавання сяброўскіх узаемаадносін Глыбоцкага раёна і Ніжагародскай вобласці ў культурна-гуманітарнай сферы. На глыбоцкай сцэне музыканты выконвалі класіку і джаз, рускія народныя песні ў сучаснай апрацоўцы і папуры беларускіх шлягераў. Творчы калектыў наведаў Глыбоцкі гісторыка-этнаграфічны музей і культурна-дэндралагічны комплекс у вёсцы Мосар.

Ансамблі мажарэтак і барабаншчыц, харэаграфічныя калектывы з Новалукомля, Дуброўна, Оршы і Шуміліна паспяхова выступілі на Міжнародным Гран-пры па мажарэт-спорце і цвірлінгу, які праходзіў **28–30 верасня** ў Санкт-Пецярбургу. Новалукомльскі ансамбль мажарэтак «Дзіва-Дэнс» заняў першае месца ў намінацыі «Помпон». Пераможцай у гэтай жа намінацыі з сольным выступленнем стала кіраўнік ансамбля Наталля Томашава.

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНАЯ РАБОТА. САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У СФЕРЫ ВОЛЬНАГА ЧАСУ

Унікальная спеўная традыцыя выканання купальскіх і жніўных песень «у перахлёст» у вёсцы Багатырская Полацкага раёна атрымала статус гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь. На працягу апошніх 48 гадоў гэту адметную традыцыю рэгіянальнай народнай культуры Полаччыны зберагаюць удзельніцы народнага фальклорнага ансамбля «Галасы спадчыны» Багатырскага сельскага Дома культуры.

КЛУБНАЯ СПРАВА

3 ліпеня ў Новалукомльскім Палацы культуры адбылося ўрачыстае адкрыццё выставы «Людзі і лёсы малой радзімы». Старажытны абрад «Розгары» правялі ўдзельнікі фальклорнага калектыву «Вяскоўцы»

Лукомльскага СДК. На выставе прадстаўлены фотаэкспазіцыя «Мы помним! Мы гордимся!», Книга Славы, матэрыялы пра знакамітых ураджэнцаў краю, работы мясцовых самадзейных мастакоў і майстроў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

17 ліпеня на сцэне Чашніцкага ГДК адбыўся канцэрт «Нет милее Родины моей», прысвечаны 95-годдзю ўтварэння Чашніцкага раёна.

31 ліпеня ў Глыбоцкім гарадскім Доме культуры прайшоў тэматычны семінар для кіраўнікоў калектываў мастацкай творчасці вакальна-харавога жанру ўстаноў культуры Глыбоцкай цэнтралізаванай клубнай сістэмы «Спецыфіка работы з вакальнымі калектывамі ў клубных установах».

2 жніўня ў Дубровенскім раённым Доме культуры адбылося ўшанаванне ветэрана культуры Анастасіі Мікалаеўны Красоўскай у сувязі з 50-годдзем яе працоўнай дзейнасці ў галіне культуры Дубровеншчыны. Павіншаваць чалавека, які ўнёс важкі уклад у развіццё культуры раёна, папулярызацыю фальклору і народных традыцый сабраліся калегі, члены сям'і і народны фальклорны калектыў «Кудзеліца», стваральнікам і нязменным кіраўніком якога з'яўляецца А. М. Красоўская.

Калектыў аўтаклуба аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Чашніцкага райвыканкама наладзіў «Свята агурка» ў в. Зарэчная Слабада. Мерапрыемства было пазнавальным і карысным, насычаным конкурсамі і душэўнай песняй.

11 жніўня жыхары в. Іст Міёрскага раёна правялі свята вёскі, у рамках якога адбылося ўшанаванне народнага фальклорнага аматарскага калектыву «Іставіца» ў сувязі з 40-годдзем з дня яго стварэння. У святочным канцэрце да выканаўцаў аўтэнтычных песень далучыліся сябры-суседзі з народнага фальклорнага калектыву «Язынка» аграгарадка Язна.

28 жніўня жыхары аграгарадка Расасна Дубровенскага раёна адзначылі 485-годдзе роднай вёскі. Віншавалі вяскоўцаў у намінацыях «Доўгажыхар», «Сэрца аддаю дзецям», «Любовь, скрепленная годами» і

11 жніўня Верацееўская бібліятэка адзначыла 70-гадовы юбілей. Удзельнікі ўрачыстасці перагарнулі старонкі летапісу бібліятэкі, добрым словам успомнілі людзей, якія прысвяцілі сваё жыццё служэнню кнізе, узнагародзілі лепшых чытачоў дыпломамі ў намінацыях: «Самы маленькі чытач», «Самы актыўны чытач», «Самая чытаючая сям'я» і памятнымі сувенірамі. У дзень юбілею бібліятэка атрымала ў дар 50 кніг ад самай актыўнай чытачкі. На працягу мерапрыемства гучалі вершы, песні, жарты, музыка.

13 верасня адбылася тэатралізаваная прэзентацыя зборніка казак «Казкі пра Шаркаўград», у які ўвайшлі казкі, легенды і гісторыі ўдзельнікаў літаратурнага клуба «Жывое слова» дзіцячай бібліятэкі. Вядучыя выступілі ў вобразах герояў новага зборніка казак – абаяльнага прывіда Сімпацягі і вядомага ўсім дзецям Шарачка. Галоўнымі героямі мерапрыемства з'яўляліся самі дзеці – аўтары казак, а таксама юныя мастакі з Шаркаўшчынскай ДШМ – аўтары ілюстрацый да гэтай кнігі.

ДУК «Шумілінская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

13 ліпеня ў Обальскай гарпасялковай бібліятэцы была праведзена інфармацыйна-пазнавальная гадзіна «Есть в травах и цветах целительная сила».

17 ліпеня работнікі дзіцячай бібліятэкі правялі краязнаўчы квэст «Тропой любви к родному краю» для вучняў 5–7-х класаў.

21 ліпеня ўдзельнікі і госці народнай літаратурна-музычнай гасцёўні «Крыніца» сабраліся ў чытальнай зале раённай бібліятэкі на тэматычную сустрэчу «Диво-дивное – песня народная».

3 жніўня ў Обальскай гарпасялковай бібліятэцы была праведзена экалагічная гульня «Кто в лесу живет, что в лесу растет?».

10 жніўня ў Мішневіцкай с/б прайшла спартыўна-забаўляльная праграма «Выбар маладога пакалення».

пытанне «Бібліятэка-клуб – цэнтр камфортнага чытання і вольнага часу: новыя ідэі і магчымасці». Была арганізавана патрыятычная экскурсія «Вишенки – кровная сестра Хатыни» на мемарыяльны комплекс, узведзены на месцы спаленай фашыстамі вёскі.

16 жніўня ў публічным цэнтры прававой інфармацыі ЦРБ прайшла тэматычная кансультацыя «Аб крэдытаванні будаўніцтва і куплі жылля ў Рэспубліцы Беларусь».

У **верасні** работнікі Чырванараніцкай і Альшанскай сельскіх бібліятэк прынялі ўдзел у арганізацыі і правядзенні выставы-прэзентацыі Альшанскага сельскага Савета «Зямля, нам дадзеная лёсам», якая прысвячалася Году малой радзімы і праходзіла ў гарадскім Доме культуры мікрараёна папяровай фабрыкі.

ДУК «Шаркаўшчынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

У ліпені ў бібліятэках ЦБС да 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў быў праведзены марафон памяці. У дзіцячай бібліятэцы прайшоў урок памяці «Жыве ў сэрцы памяць на вякі». Настаўніца СШ № 1 г. п. Шаркаўшчына Марына Хахолка пазнаёміла прысутных з матэрыяламі альбома пра сваю бабулю Алену Мяхедка – вязня канцлагера Асвенцым. М. Хахолка стала адной з пераможцаў праекта «Франтавы альбом», які праводзіўся ў рамках рэспубліканскай акцыі «Беларусь памятае». У Лужкаўскай бібліятэцы праходзіла патрыятычная акцыя «Прачытай кнігу пра вайну, стань бліжэй да подзвігу», да якой была падрыхтавана кніжная выстава «Калі хочаш міру – памятай пра вайну».

У Дворнаўскай бібліятэцы прайшла гадзіна памяці члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, былога кіраўніка раённага літаратурна-музычнага аб’яднання «Світанак» Кацярыны Сосна. На мерапрыемства прыйшлі прыхільнікі паэзіі і беларускага слова.

8 жніўня ў дзіцячай бібліятэцы адбылося мерапрыемства, прысвечанае Міжнароднаму дню кошак.

інш. З канцэртнымі нумарамі выступілі тэатр песні «Спатканне» аўтаклуба РДК і самадзейныя артысты Ляднянскага СДК.

Свята вёскі Хралы Глыбоцкага раёна арганізавалі работнікі гістарычна-культурнага цэнтра ў Івесі пры падтрымцы Псуеўскага сельвыканкама ў **жніўні**. Вяскоўцы ладзілі выставы «Хрысціянскія прысмакі», «Сыр – усяму галава», «Узор радзімы васілька», вырабаў народных майстроў. Быў зроблены экскурс у гісторыю вёскі. Выступалі ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці.

«Жыві, крынічанька!» – свята пад такой назвай арганізавалі **ў жніўні** работнікі Мазалаўскага СДК Віцебскага раёна. Правядзенне святаў калодзежа стала ў раёне традыцыйным. Сёлета яго ладзілі ля гаючай крыніцы, якая ўнесена ў спіс сямі цудаў Мазалава. Ля прыроднага аб’екта рэй вялі ўдзельніцы народнага жаночага клуба «Залаты ўзрост». Па іх ініцыятыве ў мясцовым СДК адкрылася выстава «Кветкавая ідылія».

Работнікі культуры Лёзненшчыны ў **жніўні** надалі шмат увагі арганізацыі і правядзенню святаў вёсак: у аг. Дабрамыслі, вёсках Мерзлякова, Пагосцішча, Рэчкі, Залессе і Емяльянава, Асіпенкі, аг. Крынкі, Веляшковічы, Кавалі, Бабінавічы. Святы былі напоўнены гумарам, музыкай і песнямі ў выкананні ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці Дамоў культуры. Гэтыя значныя падзеі для жыхароў сельскіх населеных пунктаў адлюстраваны ў раённай газеце «Сцяг перамогі».

У **жніўні** аграгарадок Іказнь Браслаўскага раёна святкаваў 515-годдзе з дня першага ўпамінання ў гістарычных крыніцах. У Доме культуры былі наладжаны выставы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і кулінарных страў. Удзельнікі мастацкай самадзейнасці падрыхтавалі разнастайную канцэртную праграму.

Дзень аграгарадка адзначылі ў **жніўні** жыхары Ахрэмаўцаў Браслаўскага раёна. Добры настрой падарылі ансамбль беларускай песні «Сябрына» Ахрэмаўскага ЦНК, народны хор ветэранаў вайны і працы і гурт «Браслаўскія весялухі» раённага Цэнтра культуры.

Па ўсіх абрадавых канонах правялі работнікі Заронаўскага СДК і актыў музея «Гісторыя Заронаўскага краю» трэці Спас – Арэхавы або Хлебны. Зладзілі імправізаваную сцэну, арганізавалі выставу сельгаспрадукцыі і экспазіцыю работ кіраўніка аб'яднання «Змасцярынка» СДК Аліны Капачэўскай. Былі на свяце гульні і конкурсы, прыказкі і прымаўкі, хлебны карагод і многае іншае.

Напрыканцы **жніўня** работнікі Талачынскага раённага Цэнтра культуры і народнай творчасці разам са Славенскім СДК правялі свята «Праводзіны лета» ў аграгарадку Слаўнае.

Народны тэатр сатыры і гумару «Фанограф» Гарадоцкага ГДК прадстаўляў Віцебшчыну на IX Рэспубліканскім фестывалі народнага гумару «Аўцюкі-2019», які праходзіў **13–14 верасня** ў г. Калінкавічы Гомельскай вобласці. Па выніках удзелу скарбонка ўзнагарод калектыву папоўнілася дыпломамі за II месца ў намінацыях «Тэатр мініяцюр» і «Анекдот», за III месца – у конкурсе «Міс Аўцюкі».

Работнікамі Дома культуры г. п. Балбасава Аршанскага раёна **ў верасні** была арганізавана фотавыстава пад назвай «Старое Болбасово. Вспомним былые дни».

Мазалаўскія культработнікі (Віцебскі раён) у **верасні** наладзілі свята бульбы і адзначылі старажытнае народнае свята Багач. Актыўны ўдзельнік гэтых мерапрыемстваў – народны жаночы клуб «Залаты ўзрост».

21 верасня было праведзена свята-брэнд аграгарадка Варанцэвічы Талачынскага раёна «Бульба сёння, бульба ўчора, а без бульбы проста гора!». На свята ў Варанцэвіцкі СДК завіталі госці з Райцаўскага, Славенскага, Звяняцкага сельскіх Дамоў культуры і Жукнеўскага сельскага клуба. Майстры раённага Дома рамёстваў прапанавалі выставу-продаж шматлікіх вырабаў.

27 верасня сваё 60-годдзе адзначыў Цэнтр культуры горада Наваполацка. Сёння пад сваім крылом установа культуры аб'ядноўвае 30 калектываў і ансамбляў, 11 з якіх носяць званне народных і ўзорных. У

ДУК «Сенненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

3 ліпеня на раённым свяце, прысвечаным Дню Незалежнасці і 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, работнікамі ЦРБ і дзіцячай бібліятэкі былі арганізаваны выстава-інсталяцыя «75 кніг пра Вялікую Айчынную вайну» і фотазона «Лясная школа».

1 жніўня ў ЦРБ адбылася сустрэча з расійскім паэтам Мікалаем Траццяковым і прэзентацыя яго новай кнігі «Сердца наши рядом друг о друге поют».

14 жніўня ў Багушэўскай гарпасялковай бібліятэцы быў праведзены турнір для юных інтэлектуалаў «На все ваши «Что? Где? Когда?» умные книги ответят всегда».

13 верасня, напярэдадні Дня бібліятэк, у ЦРБ прайшло мерапрыемства, прысвечанае прафесіі бібліятэкара. Цікавыя факты, бліц-апытанні, конкурсы на веданне літаратурных герояў і аўтараў вядомых кніг сталі захапляючым падарожжам у краіну «Бібліятэка». Таксама былі падведзены вынікі інтэрактыўнага конкурсу «Минутка славы. Стихи на стульчике».

ДУК «Ушацкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

26 ліпеня ў Мосарскай бібліятэцы адбылося падарожжа «Любі свой край і ўслаўляй» да Года малой радзімы, на якім прысутныя пазнаёміліся з гісторыяй вёсак Мосар і Белае. Да мерапрыемства была падрыхтавана выстава рушнікоў і прадметаў побыту продкаў.

8 жніўня ў дзіцячай бібліятэцы была праведзена гадзіна прававой асветы «Тебе о праве и право о тебе», на якую быў запрошаны старшы оперупаўнаважаны Ушацкага РАУС Дзяніс Бункевіч.

ДУК «Чашніцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

10 ліпеня на базе Дварэцкай бібліятэкі-клуба быў праведзены семінар-практыкум для бібліятэкараў на тэму «Бібліятэка новага тыпу». Удзельнікі пазнаёміліся з вопытам работы бібліятэкі-клуба, абмеркавалі

8 жніўня ў дзіцячай бібліятэцы імя Л. Талстога для наведвальнікаў школьнага лагера СШ № 1 быў праведзены біблія-круіз «Пад сцягам Вясёлага Роджэра».

12 жніўня ў бібліятэцы імя Я. Купалы ў межах індывідуальнага творчага плана па папулярызацыі беларускай кнігі «Далучыць да роднага слова» было праведзена мерапрыемства «Лепшых кніг адкрыты нам старонкі»; **22 жніўня** – мерапрыемства «По улицам с умом ходи» для школьнікаў з летняга лагера СШ № 6.

29 жніўня работнікі бібліятэкі імя Л. Талстога прынялі ўдзел у рэспубліканскай акцыі «Збяром партфель разам».

2 верасня ў дзіцячай бібліятэцы імя Л. Талстога адбыліся 2 мерапрыемствы: краязнаўчы турнір «Тут мінуўшчына з сучаснасцю сышліся» і бібліятэчнае асарці «Здравствуй, к знаниям дорога!».

6 верасня ў бібліятэцы-філіяле № 8 праходзілі тэатралізаваныя экскурсіі «Вас запрашае бібліятэка!».

8 верасня адчыніў свае дзверы Цэнтр чытання і актыўнай творчасці БиблиоPuzzle пры дзіцячай бібліятэцы імя Л. Талстога. **18 верасня** ў бібліятэцы прайшло экалагічнае свята «Закружылася лістота залатая».

У бібліятэцы імя Я. Купалы была праведзена літаратурна-музычная кампазіцыя «Вялікі воін – святы Аляксандр Неўскі» для ваеннаслужачых вайсковай часці 55719.

ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма Расонскага раёна»

100-годдзе адзначыла старэйшая на Расоншчыне Клясціцкая сельская бібліятэка. Юбілейнае мерапрыемства пад назвай «Приглашаем всех друзей, в библиотеке – юбилей» адбылося напярэдадні прафесійнага свята – Дня бібліятэк. (*Голас Расоншчыны.– 2019. – 14 верас. – С. 9.*)

харэаграфічных, вакальных, тэатральных, мастацкіх калектывах займаюцца каля 1000 гараджан ва ўзросце ад 3 да 90 гадоў.

На сцэнічна афармленай пляцоўцы ля Сітцаўскага СДК Докшыцкага раёна, пад мелодыі беларускіх песень і танцаў, з гульнямі і забавамі прайшло свята «Сырны разгуляй» у адзін з вераснёўскіх дзён.

ФЕСТЫВАЛІ, СВЯТЫ, КОНКУРСЫ

Культработнікі Віцебшчыны падрыхтавалі традыцыйныя вялікія святочныя праграмы да Купалля. Майстры з Дамоў рамёстваў вучылі жадаючых плесці купальскія вянкі, работнікі Дамоў культуры прапаноўвалі купальскія конкурсы, танцы і песні. Праводзіліся спартыўна-забаўляльныя конкурсы і, вядома ж, запальвалася купальскае вогнішча. Прыдзвінскі край на рэспубліканскім свяце «Купалле» («Александрыя збірае сяброў») у аг. Александрыя Шклоўскага раёна прадстаўлялі Гарадоцкі, Дубровенскі і Лёзненскі раёны. Работнікі культуры на сцэнічных пляцоўках прадэманстравалі брэндавыя фестывалі «Тарас на Парнасе», «Дняпроўскія галасы ў Дуброўне», «Песні сунічных бароў». У г. п. Ветрына Полацкага раёна свята народнага календара было праведзена на новы лад – «Иван Купала. Перезагрузка!». Культработнікі падрыхтавалі конкурсна-тэматычную праграму-прэзентацыю «Ярмарка купальских затей». Бібліятэчныя работнікі арганізавалі імправізаваны фітабар «Здоровая сила купальских трав». Гучалі прыпеўкі, купальскія песні, да самай раніцы грымела Folk-Dance вечарынка.

6 ліпеня жыхары аграгарадка Лужкі Шаркаўшчынскага раёна адзначылі 505-гадовы юбілей свайго населенага пункта. Урачыстыя мерапрыемствы прайшлі ў летнім амфітэатры мясцовага стадыёна. Вечарам праграма свята павольна перайшла ў тэатралізаваную дзею «У Купальскую ноч».

8 ліпеня ў аграгарадку Сар’я Верхнядзвінскага раёна адбылося святкаванне Дня сям’і, любові і вернасці. У рамках свята ў мясцовым СДК працавалі выставы духоўнай літаратуры, рэдкіх кніг, мастацкай творчасці, фотаэкспазіцыі «Храмы Верхнядзвіншчыны», «Памяць. Гонар. Жыццё».

Творчыя калектывы СДК падрыхтавалі канцэртную праграму «Исцеление любовью».

13 ліпеня на Полаччыне былі праведзены традыцыйныя святы – экафэст «Полацкая чарніка-2019» і малочны фестываль «Milkland-2019».

17 ліпеня ў рамках праекта «Мая малая радзіма» адбылося свята «Родны край любі і ведай» у аграгарадку Слабада Шумілінскага раёна. Цікавую канцэртную праграму правялі работнікі раённага Цэнтра культуры. Былі арганізаваны выставы: «Тутэйшыя» (цэнтральная бібліятэка), вырабаў майстроў Дома рамёстваў, дзіцячых малюнкаў, народнай творчасці мясцовых жыхароў.

19 ліпеня ў аг. Станіславова Дубровенскага раёна было арганізавана брэндавае свята «Праздник молока – праздник для всех». З тэатралізаваным прадстаўленнем на свята прыехалі работнікі раённага Дома культуры, свае нумары прадставілі творчыя калектывы мясцовага СДК.

20 ліпеня ў аграгарадку Зялёнка Полацкага раёна было наладжана летняе народнае свята «Кузьмінкі». Каманды з 11 сельсаветаў Полаччыны ўдзельнічалі ў тэатралізавана-гульнёвай праграме «Бабін фэст». Усе шчыра віталі «Шэсце сельскіх працаўнікоў» – перадавікоў сельгаспрадпрыемства «Зялёнка». Каманды бралі ўдзел у народных абрадавых дзеях «Мудрамер ад Кузьмы-Дзям'яна», «Выветрыванне дурноты з жаніхоў», «Капа лёсу». Гледачы разам з журы ацэньвалі і дамашнія заданні, падрыхтаваныя камандамі. Творчыя калектывы Полацкага РЦК падарылі гаспадарам і гасцям свята цудоўны канцэрт.

21 ліпеня свята народнай творчасці «Перабродская зорка» на Міёршчыне парадавала мясцовых жыхароў і гасцей. Гаспадыні падрыхтавалі адметныя тутэйшыя стравы, народныя майстры – свае вырабы і сувеніры, культработнікі – конкурсы і забавы, самадзейныя артысты – канцэртную праграму. Традыцыйнае свята сёлета праходзіла ў рамках праекта «Разам для грамады і прыроды: узмацненне працэсу развіцця ў Міёрскім раёне праз супрацоўніцтва мясцовай улады і

кніжнай выставай «У сэрцах і кнігах памяць пра вайну». Жыхары і госці горада мелі магчымасць прыняць удзел у гульні-віктарыне «Мы ведаем, памятаем», сфатаграфавацца з прадметамі ваеннага часу і паслухаць музычны мікс у выкананні ўдзельніц клуба «Бажэна».

ДУК «Пастаўская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

2 ліпеня ў ЦРБ адбылося відэападарожжа «Пастаўшчына! Тут песня жыцця, і прасторы, і волі!» (да Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь).

На працягу **ліпеня** дзіцячая бібліятэка імя У. Дубоўкі праводзіла квэст «Уважлівы чытач» для наведвальнікаў рознага ўзросту.

2 жніўня ў Варапаеўскай гарпасялковай бібліятэцы праведзена тэатралізаваная віктарына «Мы – за здаровы лад жыцця».

30 жніўня ў Лынтупскай гарпасялковай бібліятэцы адбылася чарговая сустрэча членаў клуба «Сяброўка» – літаратурны разарый пад назвай «Царыца Ружа».

ДУК «Полацкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

2 ліпеня ў бібліятэцы-філіяле № 5 прайшло чарговае мерапрыемства ў рамках рэалізацыі праекта «Бібліяпадарожжа ў краіну Разумнікаў» – завочная экскурсія па родным горадзе «Нашы славутыя землякі».

2 ліпеня ў дзіцячай бібліятэцы імя Л. Талстога прайшла акцыя «Літаратурная вахта памяці», прымеркаваная да 75-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

25 ліпеня ў бібліятэцы імя Алеся Савіцкага адбылася чарговая сустрэча ў рамках літаратурна-музычнай гасцёўні «Элегантный возраст». Даўняя чытачка бібліятэкі Аксана Хадаронак правяла вечар песні «Спявай, душа мая!».

14 жніўня супрацоўнікі аддзела па рабоце з дзецьмі ЦРБ у рамках праектаў «Библиолето-2019» і «Читально-игральный зал» запрасілі ўсіх жадаючых на літаратурны капуснік «Вясёлы кніжны агарод», **31 жніўня** на раённым свяце «Прощай, лето!» у парку «Школьны» разгарнулі бібліятэчную пляцоўку.

«Выйшла кніга пагуляць» – пад такой назвай **24 жніўня** ў Чкалаўскай гарпасялковай бібліятэцы ў рамках праекта «Библиотека вне стен» прайшла штогадовая бібліятэчная акцыя, у якой прынялі ўдзел дзеці з клуба «Друзья библиотеки» і ўсе жадаючыя юныя чытачы.

25 жніўня ў літаратурнай кавярні ЦРБ адбылася прэзентацыя IV выпуску альманаха «Времена» пад назвай «Краски лета», у які ўвайшлі вершы лёзненскіх аўтараў.

10–15 верасня супрацоўнікі ЦРБ падрыхтавалі для чытачоў шэраг мерапрыемстваў, прымеркаваных да Дня бібліятэк Беларусі. У фае бібліятэкі праходзіла акцыя «Подари книге новую жизнь». На абанеменце аддзела абслугоўвання і інфармацыі была афармлена выстава-фрэш «Кніжныя навінкі», а для прыхільнікаў класічнай літаратуры ў фае была прадстаўлена кніжная выстава «Бал классики». **15 верасня** быў арганізаваны святочны фуршэт «Дом, где согреваются сердца». Ва ўрачыстай абстаноўцы прайшла цырымонія ўзнагароджання чытачоў прэміяй года «Библиолистопад-2019». Кіраўнік народнага аматарскага літаратурнага аб'яднання «Пад абажурам» запрасіла ўсіх на паэтычнае танга Пятра Даговіча і Вольгі Пячонавай, пад назвай «Их стихи в унисон зазвучали». На мерапрыемстве адбылася прэзентацыя іх кнігі «Стихи в унисон».

ДУК «Міёрская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

Міёрская цэнтральная і дзіцячая бібліятэкі прынялі ўдзел у гарадскім свяце, прысвечаным Дню Незалежнасці і 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Літаратурна-музычны бібліяпрывал «Помнит сердце, не забудет никогда» быў прадстаўлены

грамадзянскай супольнасці», які рэалізуецца пры фінансавай падтрымцы Еўрасаюза.

23–27 ліпеня ў Глыбокім адбылося VII Міжнароднае свята «Вішнёвы фестываль». Першы дзень «Вішнёвая энергія» быў прысвечаны грамадскім арганізацыям. 24 ліпеня прайшоў Дзень спорту «Вішнёвы горад футбола». 25 ліпеня – Дзень моладзі «Вішнёвая феерыя». 26 ліпеня праводзілася тэматычная праграма «Этна-вішня». У гэты дзень адбылося адкрыццё першага абласнога пленэра майстроў дэкаратыўнага жывапісу «Райскі сад-2019», прысвечанага творчасці Язэпа Драздовіча. Удзельнічалі 23 майстры, іх маляванкі ўпрыгожылі цэнтральную плошчу горада, а многія работы майстры перадалі ў дар глыбачанам. У праграме заключнага дня «Вішнёвы край»: урачыстае шэсце «У гасцях у Вішні», тэатралізаваная праграма «Вішнёвы настрой», выстава-прэзентацыя падворкаў «Вішнёвы смак», гала-канцэрт «Вішнёвая квецень сяброўства». У рамках фестывалю прайшоў пяты па ліку конкурс баяністаў, акардэаністаў, гарманістаў «Вішнёвыя найгрышы», была арганізавана этна-вечарынка з удзелам творчых калектываў з Латвіі, Украіны, Польшчы, Грузіі, Расіі, Малдовы, Літвы. У гэтым годзе на фестываль прыехала звыш 25 замежных дэлегацый, таму што сакрэт поспеху «Вішнёвага фестывалю» – у яднанні, сяброўстве і супрацоўніцтве гасцей і ўдзельнікаў свята. (*Витебские вести. – 2019. – 30 июля. – С. 4. ; Веснік Глыбоччыны. – 2019. – 31 ліп. – С. 2, 5, 8.*)

26 ліпеня на Дубровеншчыне ў трэці раз прайшло раённае свята «Аграфэст». На сцэне Калінаўскага СДК быў арганізаваны конкурс «Бітва пасёлкаў», выступалі мясцовыя самадзейныя артысты і ансамбль песні «Грамніцы» раённага Дома культуры.

26–27 ліпеня ў Браславе ў сёмы раз адбыўся музычна-спартыўны фестываль Viva Braslav Open Air, які сабраў звыш 26 тысяч чалавек з Беларусі, Расіі, Латвіі, Літвы, Эстоніі, Францыі і інш. У рамках фестывалю на спартыўных спаборніцтвах разыгрываліся медалі і кубкі Viva Braslav. Музыкантам розных накірункаў былі прадастаўлены чатыры сцэны. Відовішчным быў фінал конкурсу «Mic Viva Braslav». Шмат гледачоў

сабраў паядынак танцораў з калектываў «Belka» (Віцебск) і «Turbo» (Латвія).

2–4 жніўня ў в. Белая Царква Чашніцкага раёна сабраліся музыканты з Беларусі, Украіны, Германіі, Польшчы і Расіі, а таксама дзі-джэі з Літвы і Аргенціны на фестываль «SPRAVA». Галоўнай падзеяй фестывалю стала будаўніцтва вежы на Чарэйскім паўвостраве для назірання за птушкамі. У рамках фэсту быў рэалізаваны праект «СТРАВА SPRAVA». Маштабная фотавыстава была прадстаўлена на адкрытых сценах будынкаў вёсак Белая Царква і Чарэя. Эксперыментальны тэатр «Голова-Нога» прыехаў на фестываль са спектаклем-рытуалам «Мова Х». Праходзілі майстар-класы, лекторыі, кінапаказы, экалагічныя вандроўкі і многае іншае. Але галоўнае – гучалі музычныя творы ў выкананні амаль 150 музыкантаў. З поспехам прайшлі выступленні мясцовых самадзейных артыстаў – вакальнай групы «Вдохновенье» Чарэйскага СДК, фальклорных калектываў «Прасніца» Іванскага Дома фальклору і «Кругліца» Кругліцкага СДК. (*Чырвоны прамень. – 2019. – 6 жн. – С. 1, 5.*)

На пачатку **жніўня** ў Віцебску і Віцебскім раёне адбыліся мерапрыемствы XVII Міжнароднага праваслаўнага фестывалю «Одигитрия». У яго рамках прайшлі конкурсы, майстар-класы і дыскусіі, духоўныя гутаркі, канцэрты, праваслаўны баль, экскурсіі. Фестываль сабраў 200 прадстаўнікоў брацкіх славянскіх народаў Беларусі, Расіі, Украіны. Кульмінацыяй фестывалю стаў гала-канцэрт у Летнім амфітэатры Віцебска.

10 жніўня жыхары Новалукомля адзначылі 55-ы дзень нараджэння свайго горада. Напярэдадні прайшлі святы мікрараёнаў і конкурс юных выканаўцаў эстраднай песні «Звёздный дождь». На юбілей прыехала дэлегацыя ўкраінскага горада-пабраціма Ладыжына. На цэнтральнай плошчы горада выступаў ваенны духавы аркестр, працавала паэтычная пляцоўка, адбыўся канцэрт «З днём нараджэння, любімы горад!» і выступленне ўкраінскага народнага вакальнага калектыву «Заграва». На стылізаваных падворках выступалі аматарскія творчыя калектывы раёна,

ДУК «Лепельская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

3 ліпеня супрацоўнікі ЦРБ правялі літаратурны марафон «Биографию Победы пишет библиотека» ў гарадскім парку, а на працягу месяца праходзіў фотавернісаж «Гэта зямля твая і мая: Лепелю – 580».

У **жніўні** на пасяджэнні прэзідыума раённага Савета дэпутатаў была абмеркавана інфармацыйна-асветная дзейнасць сярод насельніцтва, якую ажыццяўляюць бібліятэкі Лепельскай ЦБС.

Да Года малой радзімы ў Чарэйшчынскай сельскай бібліятэцы-музеі вёскі была праведзена гадзіна краязнаўства «Жыццё і побыт беларускай вёскі ў XX стагоддзі», у Велеўшчанскай сельскай бібліятэцы-клубе – краязнаўчае падарожжа «Мой край – часцінка Беларусі».

13 верасня ў ЦРБ прайшлі вытворчая нарада і Савет пры дырэктары «Праграмна-праектная дзейнасць бібліятэк: ад ідэі да паспяховай рэалізацыі».

Да 580-годдзя Лепеля была праведзена паэтычная акцыя «Лепель! Услышь еще одно признание в любви…» і адбыўся бібліятэчны фэст «Я вырос здесь – и край мне этот дорог».

ДУК «Лёзненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

3 ліпеня ў гарадскім парку пасёлка ў рамках раённага свята, прысвечанага Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, супрацоўнікамі аддзела па рабоце з дзецьмі ЦРБ была афармлена бібліятэчная пляцоўка, у аснову якой лягла кніга беларускага пісьменніка І. Сяркова «Мы з Санькам у тыле ворага». Наведвальнікі пляцоўкі прынялі актыўны ўдзел у літаратурна-гераічнай гульні «Мы, Санька і вайна», якая стала фіналам бібліятэчнага праекта «Победные вёрсты войны. “Багратион”», прысвечанага 75-годдзю вызвалення Беларусі ў ходзе аперацыі «Баграціён».

21 ліпеня ў ЦРБ быў праведзены краязнаўчы экскурс пад назвай «Гісторыя майго краю – мая гісторыя», прысвечаны 95-годдзю ўтварэння Лёзненскага раёна і Году малой радзімы.

падрыхтавалі супрацоўнікі аддзела бібліятэчнага маркетынгу для бібліятэкараў і ветэранаў ЦБС.

26 верасня ў ЦРБ прайшла бібліяноч «Вечер непотерянного времени», а ў дзіцячай – бібліяпрыцемкі «Там чудеса, там книжек много».

ДУК «Докшыцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

2 ліпеня ў Бягомльскай гарпасялковай бібліятэцы імя П. Панчанкі быў праведзены гістарычны экскурс «Вызваленне зямлі беларускай».

4 ліпеня ў дзіцячай раённай бібліятэцы была арганізавана сустрэча-рэквіем «Званы Хатыні».

11 жніўня супрацоўнікі ЦРБ правялі літаратурную гадзіну «Ён любіў Беларусь нашу мілую», прысвечаную 90-годдзю з дня нараджэння А. Ставера.

10–15 верасня ў бібліятэках сістэмы праходзіла акцыя «Библиотека – это клад для больших и для ребят».

13 верасня ў дзіцячай бібліятэцы праводзілася бібліязмярканне «У пошуках скарбаў».

21 верасня ў ЦРБ адбылася творчая сустрэча «Подари мне, осень, счастье» з пісьменніцай Вольгай Маслюковай.

ДУК «Дубровенская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

У **ліпені** для школьнікаў дзіцячая бібліятэка арганізавала бібліядэсант «Как хороши каникулы, когда ты дружишь с книгою», Будская бібліятэка – квэст-гульню «Падарожжа ў казачны лес».

У **жніўні** праходзілі мерапрыемствы з удзелам пчалаводаў: мядовыя шчадроўкі «Пчолка запрашае» ў Асінторфскай сельскай бібліятэцы-клубе, народнае гулянне «Спасовка-лакомка» ў Сіпішчаўскай сельскай бібліятэцы-клубе.

17 верасня ў ЦРБ былі праведзены краязнаўчыя чытынні «Мікалай Гарулёў. Сустрэча з творчасцю» з удзелам бібліятэкараў сістэмы.

працаваў «Горад майстроў». На наступны дзень быў арганізаваны фестываль фарбаў «Farba Fest», праводзіліся розныя забаўляльныя мерапрыемствы.

10 жніўня ў пяты раз імідж-шоу «Фарынаўская марка» парадавала жыхароў в. Фарынава Полацкага раёна яркім святам. Спартыўная частка складалася з вела-конкурсу, сямейнага турніру «Са здароўем па жыцці», стрыт-шоу «Маладзёжныя гульні» і «Гонках на выжыванне». Адным з галоўных мерапрыемстваў стаў конкурс «Тая самая Бабуля». Шляхам глядацкага галасавання быў вызначаны «Залаты голас Фарынава».

10–11 жніўня ў Докшыцах у чацвёрты раз быў праведзены рэспубліканскі «Фестываль дзвюх рэк», які супаў са святкаваннем 612-годдзя горада. Свята горада распачалося маштабнай праграмай «Малая радзіма – вялікая любоў» з удзелам дэлегацый гарадоў-пабрацімаў Дзмітрыева Курскай вобласці Расіі і Балві Рэспублікі Латвія. Працавалі тэматычныя пляцоўкі «Вобразы мілыя роднага краю», кірмаш «Алея майстроў». Святочная праграма «Віват, фестываль!» праходзіла на сцэне летняга амфітэатра. Перад гледачамі выступілі творчыя калектывы Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай абласцей, танцавальны калектыў «Піесіціенс» з г. Балві. У праграме фестывалю таксама былі агляд-конкурс «Сямейныя забавы», конкурс вакалістаў «Бярэзінскія напевы», міжнародны пленэр мастакоў «Палітра сяброў» і многае іншае.

17 жніўня ў в. Алашкі Шаркаўшчынскага раёна адбылося традыцыйнае свята «Яблычны Спас», на якое завіталі госці з Расіі, Латвіі, Літвы, а таксама Андрэй Зуйкоў – унук знакамітага садавода-селекцыянера Івана Сікоры. Для ўдзельнікаў свята быў распрацаваны «Яблычны квэст», які ўключаў 10 тэматычных пляцовак, у тым ліку спартыўную і цыркавую. Адным з пунктаў займальнай інтэрактыўнай гульні была літаратурная віктарына ў бібліядвары. У канцэртнай праграме выступілі мясцовыя артысты і самадзейныя калектывы «Айзтуры Элпу» і «Чвартакс» з Латвіі. Спецыялісты ўстаноў культуры арганізавалі святочную праграму і на адкрытай пляцоўцы ў райцэнтры.

17 жніўня свой 437-ы дзень нараджэння адсвяткаваў г. п. Бягомль Докшыцкага раёна. Каля ГДК працавалі тэматычныя пляцоўкі стылізаванага падворка «Бягомльшчына партызанская». Тут жа прайшло ўшанаванне лепшых працаўнікоў Бягомльшчыны, пераможцаў конкурсаў. Перад гасцямі і ўдзельнікамі фэсту выступілі дзіцячыя таленты пасёлка-імянінніка.

24 жніўня ў г. п. Арэхаўск на Аршаншчыне ў пяты раз адбылося свята «**Арэхавы фэст**». Працавалі тэматычныя пляцоўкі: гістарычная пляцоўка «Арэхавая даўніна» з выступленнем тэатра лялек «Батлейка» і майстар-класам па бытавых танцах, а таксама рыцарскай інсталяцыяй; інтэрактыўная пляцоўка «Арэхавае дзяцінства»; «Пляцоўка бяспекі» Аршанскага аддзела па надзвычайных сітуацыях. У праграме: фестываль дзіцячых творчых калектываў «Арэхавы трыумф», святочная праграма «Арэхавае пяцігоддзе», тэматычная дыскатэка.

Традыцыйнае свята народнай творчасці «Ляднянскі кірмаш» у чацвёрты раз правялі ў аграгарадку «Ляды» Дубровенскага раёна. У рамках свята адбыўся II раённы агляд-конкурс частушачнікаў «Харошыя хлопцы і дзеўкі – спяваюць прыпеўкі». Брэндавае свята варэння арганізавалі ў аграгарадку Добрынь. Артысты мясцовага СДК і раённага Дома культуры радавалі гасцей музычнымі нумарамі, сцэнкамі і інтэрмедыямі. (*Дняпроўская праўда. – 2019. – 17 жн. – С. 6.*)

Раённае свята малака было праведзена **ў жніўні** ў аграгарадку Вялікія Дольцы Ушацкага раёна. Адпавядалі тэматыцы свята шматлікія конкурсы, напрыклад, «Лепшы вялікадолецкі сырнік», конкурсы па ўзбіванні масла, даенні імправізаваных кароў. Арганізатары задзейнічалі ў канцэртных нумарах мноства дзяцей – удзельнікаў мастацкай самадзейнасці. Свята закончылася пастаноўкай «Чорт і баба».

Змястоўным было свята вёскі Белае Ушацкага раёна. У аграсядзібе «Рыбакова хата» былі падрыхтаваны экспазіцыі пад адкрытым небам: «Матчыны рукі», «Школьнае рэха», «Цягнік у СССР». Удзельнікі народнага клуба творчых сустрэч «Муза» Ушацкага РЦК і НТ падрыхтавалі

ДУК «Глыбоцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

Ва ўсіх бібліятэках працягвала сваю дзейнасць патрыятычная акцыя «Ніхто не забыты, нішто не_забыта». У яе рамках бібліятэкары Шунеўскай бібліятэкі **ў ліпені** арганізавалі мерапрыемства «Чытаем дзецям пра вайну».

Падчас святкавання Дня Незалежнасці і 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у парку паэзіі г. Глыбокае адбыўся паэтычны вернісаж «Я вітаю цябе, незабыўны мой край!», прысвечаны адкрыццю бюстаў пісьменнікаў-класікаў і падрыхтаваны супрацоўнікамі ЦРБ.

2 жніўня ў Івесьскай бібліятэцы ў рамках Года малой радзімы прайшла сустрэча з Аксанай Лашкевіч, гаспадыняй аграсядзібы «Краіна Мар», пераможцай абласнога этапу XI рэспубліканскага конкурсу «Жанчына года-2018» у намінацыі «Гаспадыня вёскі». Майстар-клас па вырабе народных лялек-абярэгаў арганізавала Святлана Канавалава, дырэктар сацыяльна-асветніцкай установы «Семейный клуб «Радужный терем» (г. Мінск).

Бібліятэкары прымалі актыўны удзел у арганізацыі і правядзенні святаў вёсак Празарокі, Ластавічы, Карнацкія і Сёмкі, 15-га свята «Падсвільскі світанак».

16 жніўня ў ЦРБ адбылася сустрэча з Аляксандрам Горным, кандыдатам гістарычных навук, дацэнтам кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта, які прэзентаваў збор твораў праваслаўнага дзеяча міжваеннай Заходняй Беларусі, багаслова і публіцыста Вячаслава Багдановіча.

Да Дня бібліятэк у Падсвільскай гарпасялковай бібліятэцы былі арганізаваны: біблія-кафэ «Вкусное чтение», ВООК-пляцоўка «Бібліятэка – тэрыторыя без межаў», камплімент ад бібліятэкі «Час интернета бесплатно», чытацкая стажыроўка «Час Икс, или Необычайное превращение читателя в библиотекаря», сустрэча чытаючых людзей «Спортсмены книжного моря». Прафесійнаму дню прысвячалася і святочная вечарына «365 счастливых дней библиотекаря», якую

ДУК «Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных бібліятэк»

6 ліпеня на рэспубліканскім свяце «Купалле» («Александрыя збірае сяброў») у агр. Александрыя і **14 ліпеня** на фестывалі «Славянскі базар у Віцебску» ЦРБ прадстаўляла Гарадоччыну ў складзе раённай дэлегацыі. Працаваў панадворак «Тарасава сядзіба», дзе гасцям свята супрацоўнікі бібліятэкі распавядалі пра Тараса з паэмы К. Вераніцына «Тарас на Парнасе», прапаноўвалі наведаць імправізаваны домік лесніка, дзе частавалі гарачай травяной гарбатай і духмяным варэннем. Прыцягвала да сябе ўвагу прысутных і выстава самаробных кніг «Падарожжа да Тараса». Маленькіх гасцей свята мастак ЦРБ упрыгожваў аквагрымам.

23 жніўня ў ДУК «Гарадоцкі культурна-асветніцкі центр і сетка публічных бібліятэк» прайшоў раённы семінар бібліятэчных работнікаў. Былі разгледжаны пытанні: «Бібліятэка ў адкрытай прасторы: новыя фарматы работы з наведвальнікамі. Магчымасці мабільнага бібліятэчнага абслугоўвання насельніцтва ў развіцці культурнага патэнцыялу рэгіёна», «Сацыяльнае партнёрства і супрацоўніцтва як неабходная ўмова развіцця бібліятэк на сучасным этапе: з вопыту работы цэнтральнай раённай бібліятэкі», «Краязнаўчы турызм як брэнд роднага краю: з вопыту работы Прудніцкай сельскай бібліятэкі», «Прасоўванне бібліятэк у сацыяльных сетках. Узаемадзеянне з карыстальнікамі з дапамогай сацыяльнай сеткі». Прадоўжыўся семінар выездам у Віраўлянскую с/б на пасяджэнне экалагічнага клуба «Зеленая беседка».

4 верасня супрацоўнікамі аддзела дзіцячай і юнацкай літаратуры цэнтральнай бібліятэкі для малодшых школьнікаў была праведзена квэст-гульня «Формула безопасности».

13 верасня ў ЦРБ было арганізавана мерапрыемства «Пятніца, 13», прымеркаванае да Дня бібліятэк.

да свята прэм'еры: песні «Абеліскі» на словы Валерыі Міхно і музыку Святланы Мушы, байкі Тамары Барадзёнак.

24 жніўня ў трэці раз быў праведзены рэгіянальны фестываль духоўнай творчасці і культуры «Жнівеньскія Спасы» ў аграгарадку Бачэйкава Бешанковіцкага раёна. У праграме: дзіцячы конкурс духоўнай творчасці «Божыя іскрынкі»; тэатралізаванае прадстаўленне «Спас запрасіў у госці нас!»; канцэрт творчых калектываў Бешанковіцкага, Чашніцкага і Лепельскага раёнаў; выстава твораў майстроў народнага клуба «Скарбонка»; выстава-продаж «Дзякуй пчолцы руплівай!» клуба аматараў пчалярства «Пчала» раённага Цэнтра культуры. Выставу духоўнай літаратуры «Залаты ключ» падрыхтавалі работнікі Бачэйкаўскай бібліятэкі. Разнастайныя стравы прыгатавалі ўдзельніцы народнага клуба кухні, гульні і фальклору «Бараболя» Вярхоўскага СДК. «Духмяны закуток» аформіў клуб аматараў здаровага ладу жыцця «Прырода і здароўе» Свячанскага клуба-бібліятэкі.

Шматгранным культурным мерапрыемствам стаў фестываль эксперыментальнай керамікі «Дым», праведзены **24 жніўня** ў г. п. Лынтупы Пастаўскага раёна. Арганізатары – мясцовы культурны цэнтр «Культыватар», сельскі і раённы выканкамы. Госці свята дзівіліся на работы майстроў Пастаўшчыны, набывалі сувеніры рамеснікаў, спрабавалі розныя стравы, якімі частавалі кулінары народных клубаў раёна і Беластокскага таварыства «Падляскія прысмакі». Напярэдадні фестывалю прайшоў двухтыднёвы пленэр, падчас якога керамісты з Беларусі, Расіі і Балгарыі абменьваліся вопытам, удзельнічалі ў майстар-класах і стваралі новыя вырабы.

24 жніўня ў г. п. Падсвілле Глыбоцкага раёна ў пятнаццаты раз праведзена свята «Падсвільскі світанак», прысвечанае Году малой радзімы. У рамках акцыі «Беларусь памятае» ў скверы з'явілася «Алея памяці». Пасля цырымоніі адкрыцця свята прысутным былі прапанаваны разнастайныя праграмы: «Маладосць. Талент. Поспех» узорнага духавога

аркестра Глыбоцкай ДШМ, «Вясковыя мажоры» народнага тэатра фальклору «Цярэшка», «У рытме новага дня», «Жыццё – цудоўны міг», «Няправільная казка» Падсвільскага Дома культуры.

29 жніўня ў аграгарадку Глыбачка Ушацкага раёна на пляцоўцы ля сельскага Дома культуры ладзілася раённае мерапрыемства «Свята беларускай хаты». Працавалі адмысловыя выставы, прайшла тэатралізаваная канцэртная праграма.

29 жніўня ў перадавой гаспадарцы «Гараны-Агра» Полацкага раёна правялі па старажытных звычаях народны абрад «Хлебны Спас», каб ушанаваць працаўнікоў, якія першымі скончылі жніво. Віншавалі герояў залатой нівы творчыя калектывы Полацкага РЦК і Гаранскага СДК, народны фальклорны ансамбль «Галасы спадчыны» і ансамбль песні «Фярцінка» Багатырскага СДК.

30 жніўня ў скверы гарпасёлка Ушачы было арганізавана фальклорнае свята «Рака часу». Увазе прысутных сельскія Дамы культуры прапанавалі яркія касцюміраваныя прадстаўленні пра некаторыя абрады беларусаў. Шмат эмоцый прынёс конкурс гульнёвых праграм.

30 жніўня – 1 верасня сваё 1157-годдзе ярка і крэатыўна святкаваў Полацк – самы старажытны горад Беларусі. У рамках свята было рэалізавана звыш дзесяці маштабных праектаў: «Горад майстроў», «Стужка часу», «Полацкі фэст», паэтычны open-air «Вершы над горадам», пляцоўка гістарычных інсталяцый «Полацк – малая радзіма ўсіх беларусаў», «Вулічныя музыканты» і інш. У святкаванні прынялі ўдзел звыш тысячы гасцей з розных рэгіёнаў краіны і замежжа (Латвіі, Літвы, Расіі, Украіны) – афіцыйных асоб, партнёраў, артыстаў, рамеснікаў, удзельнікаў інтэлектуальных конкурсаў і моладзевых ініцыятыў, клубаў гістарычнай рэканструкцыі. Міжнародны фестываль «На шляху з вараг у грэкі» сабраў у паркавай зоне на левым беразе Заходняй Дзвіны аматараў культуры сярэднявечча. Праходзілі рыцарскія баі, бітвы воінаў на старажытных караблях – дракарах. Зацікаўленыя ўдзельнічалі ў майстар-класах па старадаўніх рамёствах, знаёміліся з музыкай і модай тых часін, балтыйскай

віктарынах «Да здравствует библиотека!» і «Верхнядзвіншчына літаратурная», у акцыі «Я люблю бібліятэку». У памяшканні бібліятэкі была размешчана пляцоўка «Радуга творчества» з разнастайнымі выставамі, праведзена сустрэча з майстрам разьбы па косці Іллёй Мікуцкім.

ДУК «Віцебская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

У Сасноўскай бібліятэцы на працягу **ліпеня** праходзіла акцыя «З кнігай у лета».

26 ліпеня Ноўкінская бібліятэка для ўдзельнікаў клуба паэзіі і музыкі «Ліра» правяла літаратурна-музычную гадзіну «Любил он березы босые и красные гроздья рябин…» (да 90-годдзя з дня нараджэння В. М. Шукшына).

23 жніўня на пасяджэнні Віцебскага райвыканкама была прадстаўлена справаздача Віцебскай РЦБС «Пра стан і перспектывы развіцця бібліятэк раёна ў 2019 годзе» (дырэктар сістэмы Г. Д. Нісневіч) і інфармацыя: «Захоўваючы традыцыі, ствараем будучыню: праектная дзейнасць Мазалаўскай сельскай бібліятэкі» (загадчык Мазалаўскай с/б А. І. Магон); «Бібліятэчнае краязнаўства як прыярытэтны накірунак дзейнасці Курынскай сельскай бібліятэкі» (бібліятэкар Курынскай с/б М. А. Карновіч).

12–14 верасня ў ЦРБ праводзіўся Дзень адчыненых дзвярэй «Месца сустрэчы – бібліятэка». Былі арганізаваны: акцыя «Чытальная зала на свежым паветры», PR-акцыя «Бібліятэка вітае сяброў», выстава-рэйтынг «Book-сімпатыя», анонс кніжных навінак «Твае непрачытаныя кнігі». У гэтыя дні ўсе чытачы і наведвальнікі атрымалі ў падарунак флаеры «Цытата ад бібліятэкара» (пра карысць кнігі і чытання). Да Дня бібліятэк была падрыхтавана бібліятэчная газета «В библиотеке не только чтение, но досуг и общение».

18 жніўня было праведзена пашыранае пасяджэнне народнага аматарскага аб'яднання «Кругагляд» – свята першага яблыка «Мы на праздник светлый Спас приглашаем в гости нас».

27 жніўня ў ЦРБ адбылася нарада бібліятэчных работнікаў «Дзень прафесійных зносін». На нарадзе працаваў «Стол інавацый», на якім былі прадстаўлены краязнаўчыя прэс-дасье бібліятэк «Нашы землякі – наш гонар».

5–23 верасня ў дзіцячай бібліятэцы праходзіла выстава шарыкавых ручак. Больш за 450 экспанатаў былі прадстаўлены Марыяй Міцкевіча – начальнікам аддзела адукацыі, культуры і спорту Дагдскай краявой думы (Латвія).

22 верасня ў Відзаўскай гарпасялковай бібліятэцы адбылося пашыранае пасяджэнне народнага аматарскага аб'яднання «Кругагляд». Мерапрыемства «Библиотека. Люди. Годы. Жизнь» прысвячалася 80-годдзю бібліятэкі.

ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма Верхнядзвінскага раёна»

29 ліпеня ў народным клубе «Сучаснік» была праведзена творчая вечарына «Человек рождается для добрых дел». Госцем сустрэчы стаў Пётр Кваціньскі – стваральнік, натхняльнік і нязменны кіраўнік народнага клуба «Белыя вароны» пры Каханавіцкай бібліятэцы.

15 жніўня прайшло святочнае мерапрыемства з нагоды 100-гадовага юбілею старэйшай бібліятэкі раёна – Асвейскай. На свяце прысутнічалі пастаянныя чытачы, прадстаўнікі мясцовай улады, дырэктары агульнаадукацыйнай школы і школы мастацтваў, работнікі Асвейскага ГДК.

Напярэдадні Дня бібліятэк Верхнядзвінская ЦРБ імя Т. Хадкевіча адзначыла 75-гадовы юбілей. Свята пачалося на «Бібліятэчным бульвары», дзе разгарнулася выстава фотаздымкаў гісторыі бібліятэкі «Одной судьбой мы связаны». Кожны жадаючы мог паўдзельнічаць у займальных

кухняй. Творчыя калектывы дарылі песенныя і танцавальныя падарункі. У шосты раз былі праведзены «Скарынаўскія дні ў Полацку». (*Витебские вести. – 2019. – 3 сент. – С. 5. ; Полацкі веснік. – 2019. – 6 верас. – С. 4–5.*)

7 верасня Лепель адзначыў юбілей – 580-годдзе. Пасля ўрачыстага шэсця працоўных калектываў на плошчы Свабоды разгарнулася тэатралізаванае прадстаўленне, якое ілюстравала гістарычны шлях горада. У тэматычнай праграме ўдзельнічалі творчыя калектывы Лепельскага РДК, заслужаны фальклорны калектыў «Сунічкі» Стайскай школы мастацтваў і традыцыйнай культуры, Лепельскага Цэнтра рамёстваў і інш. У гарадскім парку былі арганізаваны: выстава народных рамёстваў «Лепельскі кірмаш», выстава з фондаў раённага краязнаўчага музея «Знакамітыя землякі», кулінарнае свята-конкурс «Лепельскія клёцкі», тэматычныя пляцоўкі, забаўляльныя мерапрыемствы. У летнім амфітэатры прайшла ўрачыстая праграма «Мой Лепель, ты ў сэрцы адзіны!» і адбыўся канцэрт «Са святам, любімы горад!».

Свята бульбы стала брэндавым для аграгарадка Буда Дубровенскага раёна. У шосты раз яно было праведзена на пляцоўцы каля СДК. Дзейнічалі выставы «Картофельный пир», «Картофельные диковинки», «Картофель-рекордсмен», працавала імправізаванае кафэ «Бульбаш», выступалі самадзейныя калектывы Будскага і Асінторфскага сельскіх Дамоў культуры.

Раённае мерапрыемства «Свята бульбы» арганізавалі ў аграгарадку Кублічы Ушацкага раёна. Другому хлебу беларусаў былі прысвечаны выставы, конкурсы, песні і танцы.

7 верасня ў зоне адпачынку «Сярэбраная струна» г. Талачына прайшоў раённы конкурс «Играй, гармонь, звени, частушка!». Перапынкі паміж выступленнямі творчых калектываў і гарманістаў былі запоўнены народнымі танцамі ў выкананні самадзейных артыстаў.

14 верасня г. Чашнікі маштабна адзначыў сваё 515-годдзе. У рамках святкавання адбылося ўрачыстае адкрыццё адноўленага будынка гарадскога Дома культуры. Першых наведвальнікаў прыняў у новым

будынку гістарычны музей. Адбылося ўшанаванне лепшых работнікаў, праходзілі ваенна-патрыятычныя акцыі, выступленні творчых калектываў і многае іншае.

14–15 верасня ў восьмы раз быў праведзены экалагічны фестываль «Жураўлі і журавіны Міёрскага краю», які стаў брэндам Міёршчыны. Унікальны фэст дазваляе папулярызаваць мясцовыя традыцыі, захоўваць самабытную прыроду, развіваць экалагічны турызм, усталёўваць цесныя сяброўскія сувязі з суседнімі краінамі. У семінары «Міжнароднае супрацоўніцтва як інструмент устойлівага развіцця Міёрскага раёна» прынялі ўдзел замежныя госці, у ліку якіх генеральны консул Рэспублікі Беларусь у Даўгаўпілсе Уладзімір Клімаў, Павераны ў справах Прадстаўніцтва Еўрапейскага саюза ў Беларусі Берэнд дэ Гроот, эксперт Латвійскага сельскага форуму Арыс Адлерс, дэлегацыі Апочацкага раёна Пскоўскай вобласці і Крустпілскага краю Латвійскай Рэспублікі. У рамках свята праходзіў конкурс сельскіх падворкаў «Жураўліны кірмаш-2019», была арганізавана выстава-продаж вырабаў народных майстроў «Жураўліная скарбонка» з правядзеннем майстар-класаў. Праходзілі традыцыйныя арганізаваныя экскурсіі па экалагічнай сцежцы і назіранні за жураўлямі. Краязнаўца Вітольд Ермалёнак падрыхтаваў выставу «Малая радзіма пачынаецца з зямлі». Быў пакладзены пачатак збору экспанатаў для будучага Музея жураўлёў і журавінаў. Тэатралізавана-канцэртная праграма «Жураўліная нота» ўпрыгожыла фестываль беларускімі песнямі. (*Міёрскія навіны.– 2019. – 17 верас. – С. 4–6.*)

14 верасня ў дзясяты раз прайшоў экалагічны фестываль «У гасцях у Полацкага Лесуна». Пакуль удзельнікі амаль 100 каманд збіралі грыбы, работнікі культуры праводзілі мерапрыемствы на тэрыторыі аддзела турызму і актыўнага адпачынку РЦДіМ. Бібліятэкары адкрылі «Полоцкую грибную академию» і «Лицей имени Сыроежкина», аніматары з ГДК забаўлялі дзяцей. Гучала музыка і задорныя песні. Прайшоў раённы крос «Залатая восень».

зорачку з імёнамі сваіх сваякоў-ветэранаў на «Звезду памяти великой Победы». А ў самой бібліятэцы на працягу дня трансліравалася прэзентацыя «Не бывае у вайны эпілога...: паэты-франтавікі», гучала музыка ваенных гадоў.

У **жніўні** ў бібліятэках ЦБС дзейнічалі выставы, прысвечаныя юбілеям пісьменнікаў, мастакоў, разнастайным падзеям, ладзіліся прагляды новай літаратуры. Бібліятэка імя Я. Коласа прапанавала сваім чытачам летні буккросінг «Книжная эстафета яркого лета». У Міжнародны дзень светлафора чытачы бібліятэкі імя У. Караткевіча прынялі ўдзел у пазнавальна-гульнёвай праграме «Веселый светофор». У бібліятэцы імя К. Сіманава для выхаванцаў дзіцячага сада № 32 быў арганізаваны квэст «Алиса в стране чудес», для маладых людзей з аддзялення дзённага знаходжання інвалідаў праведзена гутарка «Между Медовым и Яблочным Спасом август прольет благодать».

Галоўнай падзеяй Тыдня бібліятэк стала вялікае свята, арганізаванае **12 верасня** ў бібліятэцы імя Я. Коласа. Каля бібліятэкі працавалі імправізаваныя кніжныя пляцоўкі, якія запрашалі дзяцей і дарослых прыняць удзел у конкурсах, віктарынах, гучных чытаннях і інш. У памяшканні бібліятэкі адбылося адкрыццё выставы лялек «Эталон изящества» і сустрэча з калекцыянерам Таццянай Осіпавай.

18 верасня ў бібліятэках ЦБС у межах Еўрапейскага тыдня мабільнасці ў чацвёрты раз прайшоў велаквэст.

ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма Браслаўскага раёна»

3 ліпеня ў зоне комплексу «Свабодная бібліятэка» работнікі ЦРБ разгарнулі выставу ў фармаце open air «Беларусь і Браслаўшчына: багатая гісторыя, годная сучаснасць».

7 ліпеня ў Відзаўскай гарпасялковай бібліятэцы прайшло сумеснае пасяджэнне аматарскіх клубаў Відзаўскай гарпасялковай і Слабодкаўскай бібліятэк – паэтычны акорд «О, родная зямля! Ты – кніга вечнага жыцця!».

ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Віцебска»

У ЦГБ імя М. Горкага **10 ліпеня** была праведзена творчая вечарына папулярнай беларускай пісьменніцы Наталлі Батраковай, **18 ліпеня** адбылася сустрэча са спартсменам-гіравіком, паэтам і пісьменнікам Анатолем Яжовым.

18 ліпеня ў бібліятэцы імя Е. Полацкай прайшоў літаратурна-музычны вечар «Виртуальное путешествие» з удзелам творчых людзей г. Віцебска: паэтэсы Наталлі Салаўёвай, музыканта Міхаіла Фурса, мастакоў Уладзіміра Вальнова і Алега Кірушкіна.

6 жніўня ў бібліятэцы імя У. Караткевіча для наведвальнікаў летняга лагера СШ № 11 г. Віцебска праведзена краязнаўчая гадзіна «Шёл по городу трамвай».

16 жніўня ў ЦГБ імя М. Горкага адбылося адкрыццё персанальнай выставы Людмілы Харошанькай, члена народнага клуба самадзейных мастакоў «Контур» Культурна-гістарычнага комплексу «Залатое кальцо горада Віцебска"Дзвіна"».

Бібліятэка імя П. Броўкі **22 жніўня** запрасіла членаў Віцебскага Клубнага Дома «Крылы надзеі» на свята хлеба «Дар маленького зёрнышка».

Паэтычны дэбют «Моё творчество» – прэзентацыя кнігі вершаў Надзеі Мазур – адбыўся ў ЦГБ імя М. Горкага **23 жніўня**.

26 жніўня ў бібліятэцы імя У. Караткевіча прайшло адкрыццё выставы творчых работ вучняў ДУА «Віцебскі гарадскі цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі» «Лялькі ў казку запрашаюць...».

ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Наваполацка»

2 ліпеня супрацоўнікі ЦБ імя У. Маякоўскага правялі вулічную акцыю «Под мирным небом Беларуси». Падчас акцыі гараджане змаглі выбраць кнігу пра вайну для сваёй хатняй бібліятэкі, атрымаць у падарунак лістоўку з вершамі ваеннай тэматыкі мясцовых паэтаў і прымацаваць

14 верасня ў парку мікрараёна «Школьны» г. п. Лёзна было праведзена свята вуснай народнай творчасці і самабытнага гумару «З невычэрпнай кайстры Несцеркі».

Традыцыі і сучаснасць перапляліся ў адно на гарадскім свяце нацыянальнай культуры «Вераснёвая палітра», якое адбылося **21 верасня** ў Наваполацкім Цэнтры рамёстваў і традыцыйнай культуры. Згодна беларускаму народнаму календару на гэты дзень прыпадае заключнае свята збору ўраджаю – Багач. Урачыстае адкрыццё суправаджала фальклорная пастаноўка па матывах старадаўняга абраду, калі некалькі музычных калектываў сыходзяцца разам і дзякуюць маці-зямлі за добры ўраджай спеўным радам. У канцэртным марафоне выступілі гурт архаічных спеваў «Княжыч», тэатр песні «Субацея», ансамблі «Вербніца», «Сузор'е», «Прыдзвінскія россыпы», «Ажыначкі» і інш.

Традыцыйнае брэндавае журавінавае свята правялі **ў верасні** культработнікі Дубровенскага раёна ў аграгарадку Асінторф. Артысты мясцовага СДК падрыхтавалі тэатралізаванае прадстаўленне, адбыўся раённы конкурс «Краса Дубровенщины-2019», выступілі салісты народнай студыі «Ліра».

«Вечный огонь памяти» – пад такім дэвізам у Оршы прайшоў VI міжрэгіянальны фестываль народнай творчасці ветэранаў «Песня збірае сяброў». Выступленні творчых калектываў Віцебскай і Магілёўскай абласцей адбыліся на сцэне ГЦК «Победа» **ў верасні**.

БІБЛІЯТЭЧНАЯ СПРАВА

ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна»

4 ліпеня адбылося адкрыццё выставы аматарскай фатаграфіі Васілія Разанава «Мы». Аўтар – член Расійскага саюза пісьменнікаў, піша вершы і прозу.

22 ліпеня прайшла творчая сустрэча з расійскім навукоўцам, паэтам і спартсменам Анатолем Яжовым.

31 ліпеня адбыўся канцэрт да 5-годдзя Міжнароднай садружнасці праваслаўных аўтараў і выканаўцаў «Благадар» з удзелам лаўрэатаў міжнародных фестываляў.

9 верасня ў рамках правядзення Адзінага дня бяспекі па Віцебскай вобласці прайшло пасяджэнне клуба «Правазнайка» з удзелам прадстаўнікоў Віцебскага абласнога ўпраўлення МНС Рэспублікі Беларусь.

10 верасня адбылася прэзентацыя чацвёртага тома зборніка «Віцебскі край», у які ўвайшлі матэрыялы IV Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 80-годдзю ўтварэння Віцебскай вобласці.

10 верасня супрацоўнікі электроннай чытальнай залы правялі інфармацыйную гадзіну для школьнікаў «Кніга – крыніца ведаў», прымеркаваную да Дня бібліятэк Беларусі.

10 верасня адбылося адкрыццё выставы «Мелодыі роднай зямлі» народнага клуба аматараў фларыстыкі «Анюта» ДУ «Культурна-гістарычны комплекс «Залатое кальцо горада Віцебска «Дзвіна», прысвечанай Году малой радзімы.

10 верасня ў рамках Адзінага дня бяспекі для вучняў 3 класа ДУА «Сярэдняя школа № 34 г. Віцебска» было праведзена мерапрыемства на тэму «Гэты дрэнны добры Інтэрнэт: бяспека ў web-прасторы».

11 верасня ў рамках дня бібліятэк прайшла гадзіна прававых ведаў «Служыць Закону, Народу, Айчыне» для студэнтаў 2 курса факультэта эканомікі і права Віцебскага філіяла Міжнароднага ўніверсітэта «МИТСО».

12 верасня ў рамках міжнароднага аўтапрабегу Масква – Мінск адбылася прэзентацыя кнігі расійскага пісьменніка Сяргея Палонскага «8 великих битв 1941–1945 гг.», прысвечанай 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

12 верасня ў бібліятэцы прайшлі сацыякультурныя мерапрыемствы, прымеркаваныя да Дня бібліятэк Беларусі – прэзентацыі кніг, сустрэчы з пісьменнікамі, інфармацыйныя гадзіны, віктарыны, квэсты, бібліятэчныя акцыі, прэзентацыі бібліятэчных выстаў, экскурсіі для навучэнцаў адукацыйных устаноў горада. У аддзеле дзіцячай літаратуры працавала Школа юнага бібліятэкара, супрацоўнікі электроннай чытальнай залы правялі для школьнікаў інфармацыйную гадзіну «Кніга – мудрасць вякоў», у нямецкай чытальнай зале ўсе жадаючыя ўдзельнічалі ў пазнавальна-забаўляльнай праграме «Бібліятэчны бульвар», у агульнай чытальнай зале адбылася прэзентацыя рэдкіх выданняў з фонду бібліятэкі «Па старонках старых кніг». У фае бібліятэкі праходзіла бібліятэчная акцыя «Знайдзі сваю кнігу: чытач – чытачу». Больш за 300 чытачоў наведалі традыцыйную выставу кніжных навінак аддзела абанемента і МБА «Гартаючы новых кніг старонкі...».

12 верасня ў рамках праекта «Па старонках "Віцебскіх сшыткаў" з Людмілай Хмяльніцкай» адбылася прэзентацыя шостага выпуску гістарычнага навукова-папулярнага альманаха «Віцебскі сшытак».

12 верасня была прэзентавана новая кніга гісторыка архітэктуры Юрыя Якімовіча (1946–1994) «Сілуэты старога Віцебска: гісторыка-краязнаўчая экскурсія».

25 верасня адбыўся творчы вечар вядучага майстра сцэны Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа, артыста, пісьменніка, перакладчыка Пятра Ламана, які нядаўна адзначыў свой 70-гадовы юбілей.

26 верасня ў бібліятэцы адбылася першая лекцыя новага сезона бясплатных курсаў «Віцебск: рэальная і папулярная гісторыя роднага горада» на тэму «Мой радавод. Як шукаць сваіх продкаў».